

ЁН МОГ ЗАГІНУЦЬ У 43-М, А ДАЖЫЎ ДА СТА! 6

КЛЯШЧЫ ПРАЧЫНАЮЦЦА Ў ЛЮТЫМ 13





Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 КРАСАВІКА 2023 г.
СЕРАДА
№ 74 (29954)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый МІКСЮК, дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў:**

*«Тэрміны рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне ў гэтым годзе крыху скарочаны. Калі раней працэдура праходзіла з 2 мая да 1 чэрвеня, то сёлета яна стартуе з 10 мая. Гэтых тэрмінаў цалкам дастаткова, паколькі тэхналогія рэгістрацыі развіваецца. Застаецца форма папярэдняй дыстанцыйнай рэгістрацыі праз сайт РІКВ. Можна звярнуцца ў найбліжэйшы пункт тэсціравання і зарэгістравацца для ўдзелу ў ЦТ у любым пункце па краіне. З іншага боку — значная частка іспытаў удзельнікамі будзе пройдзена ўжо на этапе цэнтралізаванага экзамену. У сувязі з гэтым можна назваць яшчэ адну асаблівасць гэтага года — не будзе здвоеных дзён здачы ЦТ па такіх прадметах, як руская мова і матэматыка, калі назіралася вялікая колькасць удзельнікаў і трэба было забяспечыць ім камфортныя ўмовы».*

# Зашуміць зялёны лес



Фота БелТА.

Рэспубліканская акцыя «Тыдзень лесу» сёлета расцягнулася па часе на месяц — з улікам адрознення надвор'я ў розных рэгіёнах краіны. Днямі да яе падключылася самая паўночная вобласць — Віцебская. Напрыклад, учора навучэнцы і выкладчыкі Віцебскага аграрна-тэхнічнага каледжа высадзілі каля дзвюх тысяч саджанцаў елкі.

***На фота:*** ляснічы Віцебскага лясніцтва Юрый СВІЦІЧ і старшыня Віцебскай раённай арганізацыі работнікаў АПК Таццяна ДЗІКАНАВА.

## КОРАТКА

- Мінадукацыі: у ВНУ на бюджэт прымуць на 600 абітурыентаў больш.
- **Тавараабарот у сферы грамадскага харчавання Беларусі вырас на 9,8 працэнта да аналагічнага паказчыка мінулага года.**
- Ніжагарodская вобласць зацікаўлена ў набыцці электробусаў МАЗ.

Абітурыент-2023

## ШАНЦЫ СТАЦЬ СТУДЭНТАМ ПАВЫШАЮЦЦА...

### Як правільна скарыстацца створанымі магчымасцямі?

**Прыёмная кампанія 2023 года пройдзе ў новым для абітурыентаў фармаце. Але для многіх адзінаццацікласнікаў усе хваляванні ўжо засталіся ў мінулым. Сярод іх, напрыклад, пераможцы ўнутрыўніверсітэцкіх алімпіяд, што завяршыліся ў рэгіянальных ВНУ яшчэ ў лютым. А ў сакавіку сталі вядомыя імёны пераможцаў, якія былі рэкамендаваныя да залічэння ў студэнты яшчэ да заканчэння школы. Іх больш як 800 чалавек. Безумоўна, хтосьці з іх можа яшчэ перадумаць, бо да падачы дакументаў у ВНУ застаецца час. Але ў Міністэрстве адукацыі лічаць новы механізм адбору таленавітай і адоранай моладзі магутным стымулам для таго, каб выпускнікі доўга не разважалі, ці трэба ім выбраць той ці іншы рэгіянальны ўніверсітэт, тую ці іншую спецыяльнасць, а скарысталіся дадзеным шанцам. Дарэчы, спецыяльнасці, куды змогуць паступаць пераможцы такіх алімпіяд, ВНУ вызначалі самастойна, зыходзячы з патрэб рынку працы ў сваіх рэгіёнах.**

**У сакавіку завяршыўся і апошні этап рэспубліканскіх алімпіяд па вучэбных прадметах. Іх пераможцы таксама могуць смела лічыць сябе без пяці хвілін студэнтамі. Увогуле, сёлета з'явілася шмат дадатковых траекторый для паступлення ў ВНУ моладзі, якая прымала ўдзел у інтэлектуальных, творчых, спартыўных спаборніцтвах, для школьных выдатнікаў, навучэнцаў Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, выпускнікоў профільных класаў і гэтак далей. Але аб усім па парадку.**

СТАР. 5

Камунальная эканоміка

## ВАДУ — У АДПАВЕДНУЮ ТРУБУ

### Спецыялісты абмеркавалі праблемы водна-каналізацыйнай гаспадаркі



**Цэнтралізаванымі сістэмамі водазабеспячэння абсталяваны амаль сем тысяч населеных пунктаў краіны, дзесяць тысяч (у асноўным мястэчкі, дзе пражывае менш за 50 чалавек) карыстаюцца калодзежамі. У 80 % паслугі водазабеспячэння і водаадвядзення аказваюць арганізацыі ВКГ, аднак водныя праблемы рознага кшталту існуюць ва ўсіх спажыўцоў. Якасць пітной вады, бескантрольна зробленыя свідравіны, кошт паслуг водазабеспячэння і водаадвядзення, шахтавыя калодзежы — усе гэтыя ды іншыя акалічнасці работы водна-каналізацыйнай гаспадаркі (ВКГ) Беларусі абмяркоўвалі спецыялісты галіны падчас тэматычнага семінара ў Віцебску.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

з першых вуснаў

# «Мы гатовы аказаць дапамогу, каб не чужыя нам людзі нарэшце перасталі пакутаваць»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Дзянісам Пушыліным, які часова выконвае абавязкі кіраўніка ДНР. «Я думаю, Дзяніс Уладзіміравіч, ты ўжо добра ведаеш Беларусь, таму я рады, што добрае меркаванне склалася пра Беларусь», — заўважыў беларускі лідар. Ён пацікавіўся сітуацыяй у Данецкай Народнай Рэспубліцы з першых вуснаў, спытаў, як справы на фронце. «Цэнтральны так званы ўчастак у вас там самы складаны, ідуць інтэнсіўныя баі і паўночней, і паўднёвей. У напрамку Данецка абстрэлы. Людзям цяжкавата. І ў гэтай сітуацыі што Беларусь можа зрабіць для Данецка, чым мы можам дапамагчы? Работы наперадзе вельмі многа, трэба аднаўляцца, трэба прамысловыя прадпрыемствы адраджаць, сельскую гаспадарку. У рэшце рэшт людзі там жыць будуць, гэта сто працэнтаў. І карміць людзей трэба. Таму мы гатовы аказаць адпаведную дапамогу і падтрымку для таго, каб не чужыя нам людзі нарэшце перасталі пакутаваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

У тэму

## ДУМАЦЬ КАТЭГОРЫЯМІ МІРНАГА БУДАЎНІЦТВА

У размове з журналістамі Дзяніс Пушылін падкрэсліў, што цяпер самы складаны момант для Данецкай Народной Рэспублікі — абстрэлы самога Данецка і навакольных населеных пунктаў. Але перад рэспублікай стаяць не толькі гэтыя пытанні. «У нас жыве вялікая колькасць людзей, і мы не маем права не думаць катэгорыямі мірнага будаўніцтва. Вайна скончыцца, усе задачы спецыяльнай ваеннай аперацыі будуць выкананы. Хацелася б, каб гэта адбылося як мага хутчэй. Але менавіта зараз час выбудоўваць акцэнты, як далей будзе развівацца Данбас. З Аляксандрам Рыгоравічам мы прагаварылі і ваенную абстаноўку і абмеркавалі аднаўленне — гэта ўжо пра стваральную працу. Мы вызначылі пункты судакранання, узаемавыгаднага ўзаемадзеяння. Яны ёсць у тых напрамках, якія запатрабаваны ў ДНР. У Беларусі ёсць вялікія кампетэнцыі ў сельскай гаспадарцы, для нас гэта важна — вывесці на новы ўзровень сельскую гаспадарку ў рэспубліцы. Нам важны некаторыя аспекты ў прамысловасці. Нам ёсць, што здабываць, БелАЗ для нас зразумелая вытворчасць, у нас ёсць пэўная колькасць дадзенай тэхнікі, якая патрабуе абслугоўвання. Будуць запатрабаваны і новыя адзінкі тэхнікі. Акцэнты былі на тым, што супрацоўніцтва будзе ўзаемавыгаднае. І тут ёсць з чым папрацаваць», — адзначыў Дзяніс Пушылін. Ён расказаў, што менавіта з гэтымі мэтамі і звязаны яго прыезд у Беларусь: «Цяпер час выбудоўваць тую перспектыву, якая адкрыецца перад намі пасля заканчэння спецыяльнай ваеннай аперацыі. І трэба прапрацоўваць пытанні загадзя. Таму са мной прыехалі шэраг дарадцаў, міністраў, якія будуць прапрацоўваць пытанні ў практычнай плоскасці».

Парламенцкі дзённік

# СМІ, ПРАВАПАРУШЭННІ, АДТЭРМІНОЎКА АД СЛУЖБЫ

## Якія новаўвядзенні ў найбліжэйшы час закрануць нацыянальнае заканадаўства

**Учора на пасяджэнні сесіі Палаты прадстаўнікоў разгледжаны шэраг рэзанансных законапраектаў. У прыватнасці, дэпутаты ў першым чытанні разгледзелі законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі», «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб адзінай дзяржаўнай сістэме рэгістрацыі і ўліку правапарушэнняў», змяненні ў Падатковы і Лясны кодэксы.**

### Для абароны нацыянальных інтарэсаў



— Сёння ў краіне зарэгістравана 955 друкаваных СМІ, 189 тэлерадыёвяшчальных, сем інфармацыйных агенцтваў, 43 сеткавыя выданні. Беларуская інфармацыйная прастора таксама застаецца адкрытай для замежных СМІ, якія выконваюць патрабаванні заканадаўства Рэспублікі Беларусь, — падкрэсліў, прадстаўляючы змяненні ў закон «Аб сродках масавай інфармацыі», **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ.** — У нас распаўсюджваецца 1786 замежных газет, часопісаў, больш за 225 замежных тэлеканалаў. Таксама ў дзяржаўны рэестр уключана 458 распаўсюджвальнікаў друкаваных СМІ. У дзяржаўны рэестр распаўсюджвальнікаў тэле- і радыёвяшчальнікаў — 184 апараты электрасувязі і пастаўшчыкоў паслуг».

Па словах кіраўніка ведамства, усё гэта дае магчымасць развіваць нацыянальную інфармацыйную прастору. «Разам з тым з улікам глабальных геапалітычных змяненняў, новых эканамічных, тэхналагічных рэалій, выклікаў і пагроз наспела неабходнасць унясення змяненняў у заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі, — адзначыў Уладзімір Пярцоў. — Як мы ведаем, далёка не заўсёды сетка Інтэрнэт служыць развіццю грамадства і дзяржавы. Віртуальнае асяроддзе стала інструментам інфармацыйных войн, накіраваных на разбурэнне грамадскіх асноў, маральных каштоўнасцяў, а часам і цэлых дзяржаў. Даступнасць інтэрнэту шырокай аўдыторыі надае гэтай праблеме глабальны, сусветны характар. Імклівае развіццё грамадскіх адносін у сетцы Інтэрнэт запатрабавала сур'ёзнага падыходу да вырашэння праблем, якія ўзнікаюць».

Як звярнула ўвагу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Лілія АНАНІЧ,** новаўвядзенні ў заканадаўства аб СМІ, абумоўлены правапрымяняльнай практыкай, тэхналагічнымі змяненнямі, якія пастаянна адбываюцца ў нацыянальнай інфармацыйнай прасторы. «Тыя навацыі, якія ёсць у законе, фактычна адлюстроўваюць рэальныя стан тых умоў, у якіх працуе інфармацыйная прастора нашай краіны, — падкрэсліла намеснік старшыні камісіі. — Мы робім усё дзеля таго, каб закон меў тыя палажэнні, якія дазволяць Міністэрству інфармацыі аператыўна і адэкватна рэагаваць на праяўленне дэструктыўных выклікаў і пагроз».

Законапраектам вызначаюцца асаблівасці функцыянавання навінавых агрэгатараў і правы статус іх уладальнікаў. Пашыраецца пералік падстаў для анулявання пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі і абмежавання доступу да інтэрнэт-рэсурсу, сеткавага выдання, навінавага агрэгатара. Дэталізуюцца патрабаванні да дзейнасці ўладальнікаў інтэрнэт-рэсурсаў, якія распаўсюджваюць прадукцыю тэлевізійных і (або) радыёвяшчальных сродкаў масавай інфармацыі. Удакладняецца парадак дзейнасці замежных СМІ на тэрыторыі Беларусі. Замацоўваецца магчымасць прымянення адказных мер у адносінах да замежных сродкаў масавай інфармацыі, інтэрнэт-рэсурсаў, журналістаў замежных медыя.

— Уводзяцца пэўныя навацыі, звязаныя з абаронай інфармацыйнага поля і грамадскай думкі ў перыяд электаральнай кампаніі, — удакладніла Лілія Ананіч. — Мы памятаем, як «праславутыя 3 %» выкарыстоўваліся для таго, каб маніпуляваць грамадскай свядомасцю. Таму ўводзіцца норма закона аб забароне распаўсюджання інфармацыі грамадска-палітычнага характару ў перыяд электаральнай кампаніі ад арганізацый, якія праводзяць сацдаследаванні без атрымання адпаведных акрэдытацый.

### Інфармацыя аб правапарушэннях

Законапраектам «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб адзінай дзяржаўнай сістэме рэгістрацыі і ўліку правапарушэнняў» прадугледжваецца дапаўненне пераліку звестак, якія падлягаюць рэгістрацыі і ўліку ў адзіным дзяржаўным банку даных аб правапарушэннях, звесткамі аб пастанаўленнях (вызначэннях) суда касацыйнай інстанцыі. Прапануецца, што пасля вынясення рашэння аб адмене пастановы аб адміністрацыйным правапарушэнні, якая ўступіла ў законную сілу, і спыненні такой справы звесткі аб правапарушэнні выдаляюцца з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях. Пашыраецца пералік дзяржаўных органаў, якім даецца абмежаваны доступ да звестак аб правапарушэннях, што ўтрымліваюцца ў адзіным дзяржаўным банку даных аб правапарушэннях.

Як заўважыў **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Іван МАМАЙКА,** змяненні ў заканадаўства выкліканы абноўленай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, папраўкамі ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс, а таксама інфарматызацый і лічбавізацыяй грамадства. «У прыватнасці, пашырана кола фізічных асоб, якія дапушчаны да напісання заявы аб атрыманні інфармацыі з гэтай базы даных, — удакладніў дэпутат. — Раней было неабходна, каб сама асоба, у адносінах да якой рыхтуецца інфармацыя аб правапарушэннях, асабіста прыбывала ў тэрытарыяльны орган унутраных спраў або пісала заяву па электроннай пошце, адпаведна асабіста ёй на рукі выдаваліся гэтыя звесткі. Цяпер у кампетэнтныя органы можа звярнуцца любая асоба, але інфармацыя будзе выдавацца толькі таму грамадзяніну, што запрасіў патрэбныя звесткі».

— Законапраект падрыхтаваны з мэтай удасканалення прававога рэгулявання адносін, звязаных з улікам і рэгістрацыяй правапарушэнняў, — адзначыў **намеснік міністра ўнутраных спраў — камандуючы ўнутранымі войскамі Мікалай КАРПЯНКОЎ.** — Змяненні і дапаўненні, якія ўносяцца праектам у закон, накіраваны на прывядзенне яго ў адпаведнасць з заканадаўчымі актамі, а таксама абумоўлены існуючай правапрымяняльнай практыкай. Прыняцце Закона «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб адзінай дзяржаўнай сістэме рэгістрацыі і ўліку правапарушэнняў» дасць магчымасць забяспечыць паўнату ўліку правапарушэнняў, удасканаліць парадак атрымання, захоўвання і атрымання інфармацыі аб правапарушэннях, забяспечыць узгадненне яго норм з палажэннямі іншых заканадаўчых актаў і не запатрабуе выдзялення дадатковых бюджэтных сродкаў, звязаных з яго рэалізацыяй.

### Навучанне за мяжой і адтэрміноўка ад службы

У прадстаўленым у другім чытанні праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў» удакладняюцца падставы для атрымання права на адтэрміноўку ад прызыву на воінскую службу, устанаўліваецца часовае абмежаванне на выезд з Беларусі асоб, у адносінах якіх вядзецца адміністрацыйны працэс. Акрамя таго, замацаваны парадак узгаднення выезду з Рэспублікі Беларусь кіраўнікоў дзяржаўных органаў, а таксама кіраўнікоў дзяржаўных арганізацый і супрацоўнікаў, што ажыццяўляюць забеспячэнне дзейнасці і тэхнічнае абслугоўванне дзяржаўных органаў, якія маюць доступ да дзяржаўных сакрэтаў.

— Што датычыцца пытання адтэрміноўкі ад прызыву на тэрміновую ваенную службу і службу ў рэзерве для працягу адукацыі ва ўстановах адукацыі за мяжой, раней такая адтэрміноўка давалася, — канкрэтызавала **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Валянціна РАЖАНЕЦ.** — Аднак вывучэнне заканадаўства іншых краін прадэманстравала, што практычна нідзе такой ільготы няма. У Беларусі дзейнічае звыш 60 падстаў для атрымання адтэрміноўкі. Тыя, хто навучаецца ў беларускіх ВНУ, гэтым правам карыстаюцца, але для навучання за мяжой цяпер адтэрміноўка даецца толькі па дзяржаўных праграмах і па рэкамендацыях дзяржаўных органаў, арганізацый і ўстаноў. Часта пытаюцца, што будзе з тымі, хто ўжо паступіў і вучыцца за мяжой? Тыя, хто атрымаў адтэрміноўку, будзе карыстацца ёю да спынення падстаў яе атрымання — пакуль не скончыць сваю навучальную ўстанову. Адтэрміноўка даецца адзін раз. Для тых, хто паступіў ва ўстанову адукацыі за мяжу ва ўзросце да 18 гадоў і на момант уступлення ў сілу закона навучаецца ў вочнай форме навучання, адтэрміноўка будзе захоўваца.

### Змяненні ў кодэксы

Законапраектам «Аб змяненні Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь», адобранага ў першым чытанні, прапануецца ўстанавіць у Падатковым кодэксе дзяржаўную пошліну для рэгістрацыі транспартнага сродку дыпламатычных і іншых прадстаўніцтваў, замежнай дзяржавы, іх супрацоўнікаў, міжнародных арганізацый ў памеры чатыры базавыя велічыні (цяпер яна складае дзве).

Новаўвядзеннямі ў Лясны кодэкс замацоўваецца кампетэнцыя кіраўніка дзяржавы па вызначэнне адносін у галіне выкарыстання, аховы, абароны і ўзнаўлення лясоў у лясным фондзе, які выкарыстоўваецца ў мэтах нацыянальнай бяспекі, а таксама на ўстанаўленне парадку ажыццяўлення дзейнасці на ўчастках ляснога фонду, які выкарыстоўваецца ў мэтах нацбяспекі. Для службовых асоб, якія надзелены паўнамоцтвамі дзяржаўнай аховы ляснога фонду, з'яўляецца магчымасць спыняць транспартныя сродкі, затрымліваць тых асоб, якія здзейснілі злачынства або адміністрацыйнае правапарушэнне. Таксама супрацоўнікі дзяржаўнай лясной аховы могуць выкарыстоўваць або прымяняць фізічную сілу, зброю або спецыяльныя сродкі, выкарыстоўваць спецыяльныя транспарт для таго, каб ажыццяўляць сваю дзейнасць.

Акрамя таго, у Палаце прадстаўнікоў разгледзелі шэраг міжнародных пагадненняў, якія датычацца супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй і Сірыйскай Арабскай Рэспублікай.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, намесніку адказнага сакратара — начальніку апарату Прадстаўніцтва Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі Дзмітрыю Дзмітрыевічу Гобараву ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

Лічбавізацыя

# ТЭХНАЛАГІЧНАЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ І ЛІЧБАВЫ СУВЕРЭНІТЭТ

## Задача форуму ТІБА — паказаць магчымасці для раскрыцця інавацыйнага патэнцыялу



**За гады правядзення форум ТІБА стаў самай прадстаўнічай з'явай у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ) у Беларусі, якая садзейнічае лічбаваму развіццю і ўкараненню інавацыйных тэхналогій ва ўсе сферы жыццядзейнасці. У краіне ўжо звыш 11,7 мільёна сотавых абанентаў, а ў рэйтынгу паштовага развіцця Сусветнага паштовага саюза Беларусь займае 13-е месца сярод 172 краін. Па леташніх выніках, у структуры ВУП удзельная вага галіны лічбавізацыі склала 6,6 %. Сёлета форум сабраў звыш 260 айчынных і замежных удзельнікаў выстаўкі, а падчас дзелавой праграмы цягам чатырох дзён тут пройдзе больш як 30 мерапрыемстваў.**

### АЛІЧБАВАЦЬ МОЖНА ПРАКТЫЧНА ЎСЁ

Штучны інтэлект — новы мозг у творчасці, упраўленні і камунікацыі. Робаты са штучным інтэлектам — «рукі» ў вытворчасці, а беспілотны транспарт — новыя «ногі» ў перавозках і лагістыцы, заўважыў, вітаючы гасцей форуму падчас яго афіцыйнага адкрыцця, **прэм'ер-міністр краіны Раман ГАЛОЎЧАНКА:**

— Ужо амаль 30 гадоў ТІБА збірае на сваёй пляцоўцы людзей, чыя дзейнасць, а ў многім і жыццё, звязана з вялізнай сферай ІКТ, тых, хто развівае, арганізоўвае практычнае ўкараненне ці імкнецца эфектыўна выкарыстоўваць магчымасці гэтых амаль бязмежных тэхналогій. Цяпер мы будуем якасна новую мадэль функцыянавання эканомікі, грамадства і дзяржавы. Маё выступленне магло б быць цалкам сгенерыравана з дапамогай нейрасеткі, і вы б гэтага нават не заўважылі.

Асноўнымі кірункамі работы праграмістаў 30 гадоў таму былі бухгалтарскія і навуковыя разлікі, а цяпер практычна любую сферу жыццядзейнасці можна алічбаваць і надзяліць зручнай для карыстальніка мабільнай праграмай. Контуры новага лічбавага свету значна бліжэйшыя, чым здаецца, і задача форуму ТІБА-2023 — даць комплекснае бачанне дасягненняў і магчымасцяў для максімальнага раскрыцця інавацыйнага патэнцыялу ІТ-сферы ў інтарэсах грамадства і дзяржавы, а таксама партнёраў, найперш у межах Еўразійскага эканамічнага саюза, дадаў прэм'ер.

— Ва ўмовах складанай геапалітычнай сітуацыі вельмі важна забяспечваць тэхналагічную незалежнасць і лічбавы суверэнітэт.

Правядзенне ў межах ТІБА Еўразійскага лічбавага форуму, які збірае прадстаўнікоў прафесійнай суполкі краін — удзельніц ЕАЭС, стала неад'емнай і значнай часткай мерапрыемства, зазначыў **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА:**

— Развіццё лічбавай эканомікі вельмі важнае для фарміравання адзінай эканамічнай прасторы ЕАЭС і паглыблення супрацоўніцтва яго ўдзельнікаў. Неабходна актывізаваць работу па рэалізацыі агульных працэсаў у сферы лічбавізацыі. Ва ўмовах высокіх тэмпаў тэхналагічнага развіцця ІТ-сферы лічбавы парадак дня патрабуе актуалізацыі, найперш інтэграванай інфармацыйнай сістэмы ЕАЭС, якая забяспечвае сумесную работу дзяржаўных інфармрэсурсаў і сістэм дзяржаў саюза. Тэндэнцыю па павелічэнні спектра лічбавых задач, якія вырашаюцца на базе ЕАЭС, трэба падтрымаць і прапанаваць перадавыя напрацоўкі калегам у межах СНД, ШАС і БРІКС.



### БЕЛАРУСКІ БРЭНД І МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Лічбавізацыя выводзіць эканоміку на якасна новы ўзровень і становіцца адной з умоў поспеху ў канкурэнтнай барацьбе на сусветных рынках. Узмацняецца ўплыў перадавых тэхналогій на жыццё людзей, асабліва ў будаўніцтве, адукацыі, галіне аховы здароўя, забеспячэнні ўсіх сфер нацыянальнай бяспекі, таму акцэнт выстаўкі на ўкараненні рашэнняў, якія павышаюць даступнасць тэхналогій разумнага горада, вельмі важны, упэўнены **Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ, дзяржсакратар Савета бяспекі:**

— Кіберзлачынцы прымяняюць найноўшыя дасягненні ў сферы інфармацыйных тэхналогій, у сувязі з чым як ніколі важным становіцца развіццё нацыянальнай сістэмы кібербяспекі.

Лічба існуе паўсюдна, і вынікі, якія ўжо дасягнуты ў лічбавізацыі ў краіне, дазваляюць ганарыцца імі, перакананы **Канстанцін ШУЛЬГАН, міністр сувязі і інфарматызацыі, старшыня арганізацыйнага камітэта форуму ТІБА,** які абвясціў мерапрыемства афіцыйна адкрытым і пажадаў прысутным плённай працы:

— ТІБА сапраўды стаў унікальным брэндавым беларускім мерапрыемствам, у якое ўваходзіць выставачная частка, дзе дэманструецца тое, што ўжо ўкаранілі ў жыццё і плануем укараняць. А на дзелавой частцы мы можам абмеркаваць тое, што ў нас у праектах і планах, пачуць меркаванні іншых спецыялістаў, што важна для прыняцця маштабных рашэнняў, ад якіх залежыць эфектыўнасць работы дзяржавы і галін эканомікі.

На шматлікіх стэндах выстаўкі цягам чатырох дзён можна «пакаштаваць» лічбавыя прадукты айчынных кампаній і ведамстваў; паблукаць па «адукацыйнай алеі», якую стварылі беларускія і расійскія ўстановы адукацыі; даведацца пра міжнароднае і сумеснае лічбавае супрацоўніцтва на экспазіцыях «РусатамБел», прадпрыемстваў Масквы, Санкт-Пецярбурга, Ніжагародскай і Курскай абласцей, Беларуска-кітайскага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» і іншых.

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Добрая навіна

# Ад мая вырастуць працоўныя пенсіі

**З 1 мая ў Беларусі вырастуць працоўныя пенсіі. У сярэднім прыбаўка складзе 5 %.**

Як паведамляе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта ад 17 красавіка 2023 года № 107 «Аб павышэнні пенсій» з 1 мая павышаюцца ўсе віды працоўных пенсій — па ўзросце, за выслугу гадоў, па інваліднасці, з прычыны страты карміцеля.

У выніку пераразліку памер працоўнай пенсіі будзе павышаны на пяць працэнтаў. А сярэдні памер пенсіі па ўзросце непрацоўнага пенсіянера ў маі бягучага года складзе 705 рублёў і павялічыцца на 21 працэнт у адносінах да мая 2022-га.

Памер павелічэння пенсіі ў кожнага пенсіянера будзе свой у залежнасці ад працягласці стажу і велічыні заробку, улічаных пры вылічэнні яму пенсіі, а таксама ўстаноўленых даплат да асноўнай пенсіі, звяртаюць увагу ў міністэрстве.

У цэлым жа ў маі расходы на выплату пенсій складуць 1,5 мільярда рублёў, з іх 78 мільёнаў рублёў — іх павышэнне згодна з указам. Атрымальнікамі працоўных пенсій у краіне з'яўляюцца 2,3 мільёна чалавек.

Апошні раз працоўныя пенсіі павышаліся ў снежні 2022 года.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Бундэстагу заявілі аб канцы гегемоніі Захаду



Гегемонія заходніх дзяржаў падыходзіць да канца, большасць краін свету не жадаюць прытрымлівацца курсу Злучаных Штатаў і НАТА. Такое меркаванне ў артыкуле для выдання Jungle Welt выказала член камітэта Бундэстага Германіі па міжнароднай палітыцы Севім Дагдэлен, паведаміла РІА «Навіны». На думку Дагдэлен, улады ЗША ў сваім супрацьстаянні з Расійскай Федэрацыяй і Кітаем імкнуцца стварыць «свет неакаланіяльнага прыгнёту». Гэта робіцца з той мэтай, каб не дапусціць сітуацыі, калі Захад страціць свой статус гегемона. Дагдэлен лічыць, што спробы падпарадкаваць сабе астатні свет толькі ізалююць заходнія краіны. Большасць дзяржаў свету і іх народаў не жадаюць прытрымлівацца курсу Захаду. Дэпутат Бундэстага таксама адзначыла, што ў дзяржавах глабальнага Поўдня сёння пражывае 87 працэнтаў насельніцтва планеты. І гэтыя краіны адмаўляюцца падтрымліваць санкцыі супраць Расіі і ўмешвацца ў проксі-вайну, якую НАТА вядзе ва Украіне. Па словах Дагдэлен, імкненне свету да шматпалярнасці можна ўбачыць праз эканамічныя пераўтварэнні. Усё больш краін падтрымліваюць адмову ад амерыканскага долара як рэзервовай валюты, дзяржавы глабальнага Поўдня пашыраюць супрацоўніцтва паміж сабой, а такія краіны, як Кітай, Бразілія і Індыя, нарошчваюць эканамічную моц.

### Амаль 90 працэнтаў французаў асцерагаюцца, што беспарадкі ў краіне стануць пастаяннымі



Большасць французаў занепакоеныя тым, што сёлетнія беспарадкі ў краіне, якія праходзяць на фоне пенсійнай рэформы, стануць пастаяннымі. Аб гэтым паведаміла французскае выданне Le Figaro. Сацыёлагі з Fiducial/Odoxa па замове Le Figaro правялі сацыялагічнае апытанне, падчас якога жыхарам краіны прапаноўвалася пазначыць сваё стаўленне да масавых акцый пратэсту ў Францыі. Даследаванне праводзілася 5—6 красавіка, у ім узялі ўдзел звыш тысячы жыхароў краіны, старэйшыя за 18 гадоў. Згодна з апытаннем, 88 працэнтаў рэспандэнтаў думаюць, што беспарадкі ў Францыі будуць праходзіць увесь час. Пры гэтым каля 58 працэнтаў апытаных дапускаюць, што ўдзельнікі пратэстаў могуць вырашыцца на штурм дзяржустановы, па аналогіі з тым, што адбывалася 6 студзеня 2021 года з амерыканскім Капітоліем.

### Ілан Маск заявіў, што развіццё штучнага інтэлекту можа пагражаць знішчэннем чалавецтва



Амерыканскі прадпрымальнік і мільярдэр Ілан Маск лічыць, што развіццё штучнага інтэлекту можа прывесці да знішчэння чалавецтва, паведаміла ТАСС са спасылкай на інтэрв'ю Маска тэлеканалу Fox News. На думку Маска, штучны інтэлект мае «патэнцыял для знішчэння цывілізацыі». Ён адзначыў, што падобны сцэнарый быў у фільмах «Тэрмінатар». «Але ўсё адбудзецца не як у «Тэрмінатары», таму што інтэлект будзе знаходзіцца ў цэнтрах апрацоўкі даных. Робаты будуць толькі канчатковым фактарам», — папярэджвае ён. Пры гэтым Ілан Маск мяркуе, што ўсё ідзе да таго, што штучны інтэлект будзе прымаць рашэнні за людзей, якія ўжо не будуць здольныя яго адключыць. У сувязі з гэтым прадпрымальнік заявіў аб неабходнасці дзяржаўнага кантролю ў сферы штучнага інтэлекту.

# ВАДУ — У АДПАВЕДНУЮ ТРУБУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## АДНОЛЬКАВЫ КОШТ ДЛЯ ЎСІХ ДЗЕЛЯ САЦЫЯЛЬНАЙ СПРАВЯДЛІВАСЦІ

Падчас Паслання беларускаму народу і парламенту Прэзідэнт адзначыў, што сацыяльная справядлівасць — адна з галоўных умоў суверэнітэту і незалежнасці краіны. Сацыяльная справядлівасць у галіне водазабеспячэння і водаадвядзення — гэта роўны доступ да атрымання і карыстання паслугамі па аднолькавым кошце, адзначыў **Андрэй ХМЕЛЬ, міністр ЖКГ:**

— *Аб'ём паслугі водазабеспячэння для насельніцтва складае 339 млн м³ у год, а паслугі водаадвядзення — 291 млн м³. З гэтага вынікае, што вялікая частка сцёкавых вод вывозіцца асенізацыйным транспартам ці не вывозіцца ўвогуле. Сёння паслугу па вывазе сцёкавых вод аказваюць не толькі арганізацыі ВКГ, але і індывідуальныя прадпрымальнікі і перавозчыкі (апошнія ўжо занялі траціну рынку).* У сувязі з гэтым у краіне існуюць праблемы кантролю за месцамі зліву сцёкавых вод і цэнаўтварэння на гэтую паслугу.

Кошт вывазу аднаго кубаметра сцёкавых вод вар'іруецца ад пяці да адзінаццаці рублёў, бывае, даходзіць і да 15. Пры гэтым тарыф паслугі водаадвядзення — 1,12 рубля. Разам з тым першы крок для стварэння роўных умоў грамадзянам ужо зроблены ў Крупках, дзе была прыкмета цэнтралізаванай сістэмы водаадвядзення, аднак тарыфы вызначаліся такія, нібыта сцёкавыя воды вывозіліся асенізацыйным транспартам. Адпаведныя змены ўнеслі ў пастанову Саўміна № 571 аб парадку, і сёння жыхары атрымліваюць паслугу водаадвядзення па тарыфах, паведаміў міністр:

— *Гэтыя затраты мы дазволілі ўнесці ў агульны сабекошт і раскідаць на аб'ём паслугі, каб атрымаць цану, якая, няхай і нязначна вышэйшая, але ж аднолькавая для ўсяго рэгіёна. І падобную работу трэба працягнуць. Неабходна скласці тэхнічную і фінансавую мадэль і ацаніць магчымасць вывазу сцёкавых вод асенізацыйным транспартам арганізацый ВКГ па тарыфах водаадвядзення. Пры гэтым павінна існаваць нарміраванне аб'ёму вывазу і аднясенне затрат па вывазе на сабекошт паслугі водаадвядзення. Гэта неабходна, каб ацаніць, наколькі падаражэе паслуга водаадвядзення для людзей па краіне, калі яе зрабіць роўнай для ўсіх.*

Неабходна таксама развіваць сеткі водазабеспячэння на ўзроўні з сістэмамі каналізацыі. Інакш ствараюцца ўмовы, каб людзі выкарыстоўвалі септыкі, што таксама не вельмі добра, упэўнены камунальнікі.

## ПАТЭНЦЫЯЛ АБ'ЁМУ РЭАЛІЗАЦЫІ

— *За апошнія пяць гадоў аб'ём рэалізацыі вады арганізацыямі ВКГ, у тым ліку шматпрофільнымі, знізіўся на 1 % і цяпер складае 442 млн м³ у год, а рэалізацыя паслугі водаадвядзення зменшылася на 2,5 % — да 441 млн м³. Такія аб'ёмы ўплываюць і на аб'ёмы прамысловай вытворчасці, і гэта таксама паказчык развіцця сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення*, — канстатаваў міністр.

Ён бачыць перспектыву павелічэння аб'ёму рэалізацыі вады мінімум на 28 млн м³ за кошт развіцця сістэмы водазабеспячэння і водаадвядзення і ў наступным — падключэння новых спажыўцоў. Аднак з боку некаторых арганізацый (Мінскай і Магілёўскай абласцей) ЖКГ назіраецца адсутнасць зацікаўленасці ў развіцці ўласных сетак водазабеспячэння і водаадвядзення. Таму Андрэй Хмель прапанаваў у перспектыве адным з крытэрыяў ацэнкі эфектыўнасці работы ВКГ вызначыць рост колькасці паслуг, якія аказваюцца, спажыўцам. А адказнасць за невыкананне гэтага ўскласці на кіраўніка прадпрыемства праз дэпрэміраванне. Аднак рост павінен быць не ў аб'ёме, а ў прырасце спажыўцоў.



**Аб'ём паслугі водазабеспячэння для насельніцтва складае 339 млн м³ у год, а паслугі водаадвядзення — 291 млн м³. З гэтага вынікае, што вялікая частка сцёкавых вод вывозіцца асенізацыйным транспартам ці не вывозіцца ўвогуле. Сёння паслугу па вывазе сцёкавых вод аказваюць не толькі арганізацыі ВКГ, але і індывідуальныя прадпрымальнікі і перавозчыкі (апошнія ўжо занялі траціну рынку). У сувязі з гэтым у краіне існуюць праблемы кантролю за месцамі зліву сцёкавых вод і цэнаўтварэння на гэтую паслугу.**

## АСАБІСТЫЯ СВІДРАВІНЫ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ І ПАДВОРКАХ

Пастановай Саўміна № 746 аб будаўніцтве водазаборных збудаванняў прадугледжана магчымасць прыняцця мясцовымі органамі дазволу прабурыць свідравіну для юрыдычных асоб пры наяўнасці тэхнічнай магчымасці ўжываць ваду з цэнтралізаванай сістэмы водазабеспячэння. І «Магілёўхімвалакно», напрыклад, вырашыла, што яму танней карыстацца сваёй свідравінай, чым атрымліваць ваду ад камунальнікаў, прывёў прыклад міністр:

— *Гэта прывядзе да зніжэння рэалізацыі вады ў аб'ёме 548 тысяч м³, а гэта валавы рэгіянальны прадукт (1,2 млн рублёў), зменшыць загрузку водазаборных збораў і пакіне ў рэзерве водазабор, які і будаваўся для забеспячэння гэтага прадпрыемства вадой. Будзе не задзейнічана 9,5 кіламетра водаправода. Гэта зменшыць фінансавыя паказчыкі Магілёўскага водаканала. Пры гэтым прадпрыемства не збіраецца адразаць сябе ад гэтых сетак, кажучы, што гэта іх рэзерв магутнасці. Таму мы прапануем унесці ў заканадаўства змены, каб прыняцце такога рашэння абмяркоўвалася з улікам інтарэсаў усіх зацікаўленых, інакш у будучыні гэта прывядзе да стратнасці ВКГ. А прадпрыемства няхай аплачвае затраты на ўтрыманне сетак, якія засталіся ў рэзерве.*

Бескантрольна робяць сёння і свідравіны на прыватных падворках, аднак калі існуе сістэма цэнтралізаванага водазабеспячэння, а яшчэ і каналізацыі, то атымліваецца, што людзі ваду са сваёй свідравіны ўзялі, а ў нашу каналізацыю зліллі і ні за што не заплацілі. Так што трэба, пэўна, як мінімум, абмяжоўваць бурэнне такіх свідравін, дзе ёсць цэнтралізаваныя сістэмы, лічыць міністр.

— *Адносна каналізацыі ў сельскай мясцовасці варта перайсці на фіксаваны тарыф на існаванне рэзервовай магутнасці, таму што чалавек падключаны да каналізацыі*, — пагадзіўся **Анатоль СІВАК, намеснік прэм'ер-міністра,** з прапановай міністра ЖКГ і задаўся пытаннем: — *Чаму спецыялісты ВКГ не прыходзяць на дачы і не прапануюць людзям узяць іх сістэмы на баланс? Нават калі сістэмы водазабеспячэння і водаадвядзення збудаваны самімі прадпрыемствамі ці таварыствамі, гэтыя сеткі ўласнікі імкнуцца перадаць на баланс ЖКГ, калі з імі пачынаюцца праблемы.*





Ёсць ва ўласнасці жыхароў, у прыватнасці садовых таварыстваў, сістэмы водазабеспячэння, якія яны стварылі самастойна і за станам якіх фактычна ніхто не сочыць, а пасля людзі скардзяцца на якасць пітной вады. Так што будаўніцтвам і эксплуатацыяй сістэм водазабеспячэння павінны займацца спецыялізаваныя арганізацыі ВКГ. Аднак садовыя таварыствы не з'яўляюцца населенымі пунктамі, таму заканадаўча немагчыма абслугоўваць іх сеткі, і неабходны змены ў закон аб пітным водазабеспячэнні.

## З ГРАШЫМА ЛЮДЗЕЙ І РАСХОДАМ НА ПАЖАРАТУШЭННЕ

Грамадзяне гатовыя ўдзельнічаць у будаўніцтве водных сетак, аднак арганізацыі воднай гаспадаркі разглядаюць гэтае пытанне не як першачарговае, расказала **Ірына РОЎБА, намеснік генеральнага дырэктара «Белводаканала».**

— *Яскравы прыклад гэтага — падыход Баранавіцкага водаканала да будаўніцтва каналізацыі. Замест комплекснага падыходу па паслядоўным развіцці квартала індывідуальнай жылой забудовы водаканал выдаў асобным грамадзянам толькі тэхнічныя ўмовы (ТУ) на праектаванне адасобленых участкаў сетак. Людзі мусілі самастойна распрацоўваць праектную дакументацыю на будаўніцтва асобных участкаў вулічных сетак, у тым ліку з узвядзеннем магістральных сетак за іх кошт. Згодна з пастановай урада № 788, ТУ выдаюцца грамадзянам на далучэнне жылога дома да існуючых сетак водазабеспячэння і водаадвядзення ў межах адміністрацыйнай працэдуры. Вулічныя і магістральныя сеткі будуюцца на падставе дазвольнай дакументацыі. А водаканал у парушэнне гэтага выдаў грамадзянам ТУ на будаўніцтва размеркавальных і магістральных сетак. Каб не дапусціць падобных сітуацый, ва Указ № 488 аб будаўніцтве водных сетак неабходна ўнесці наступныя змены. Вызначыць заказчыкам-забудоўшчыкам будаўніцтва размеркавальных вулічных сетак арганізацый ВКГ і ўстанавіць, што фінансаваць будаўніцтва будзе ВКГ з прыцягненнем сродкаў грамадзян і наступным абслугоўваннем арганізацый ВКГ. А для пералічэння грошай стварыць кааператывы.*

Існуе таксама праблема неабгрунтаванасці норм праектавання для патрэб пажаратушэння. На адзін кіламетр сістэм водазабеспячэння сёння прыходзіцца два пажарныя гідранты. Аднак будаўнічымі нормамі прадугледжана, што гідрант неабходны на кожныя 260 метраў. У населеных пунктах з жыхарамі да тысячы чалавек нормамі ўвогуле не прадугледжаны нормы расходу на пажаратушэнне. Акрамя таго, пры праектаванні сістэм водазабеспячэння закладваюцца завышаныя нормы расходу вады. Усё гэта вядзе да павелічэння капітальных затрат на будаўніцтва аб'ектаў. А абслугоўванне 70 тысяч пажарных гідрантаў, якія сёння знаходзяцца на балансе арганізацый ВКГ, складае каля сямі мільёнаў у год. Так што нормы супрацьпажарнага водазабеспячэння варта перагледзець, лічаць воднікі.

## МІНІ-СТАНЦЫІ АБЕЗЖАЛЕЗВАННЯ І КАМПОСТ З АСАДКАЎ СЦЁКАВЫХ ВОД

У плане якасці вады павінны стварацца роўныя ўмовы і ў горадзе, і ў сяле, перакананы **Аляксей ХВАЛЬКО, дырэктар «Віцебскаблводаканала»,** які расказаў, што за апошняе пяцігоддзе (2018—2022 гг.) на водазабеспячэнне і водаадвядзенне ў вобласці было накіравана 116 мільёнаў рублёў:

— *Працуючы над якасцю, мы будуем станцыі абезжалезвання (за пяцігоддзе ў буйных населеных пунктах вобласці іх з'явілася 136), пракладваем сеткі. У вобласці пітной вадой нарматыўнай якасці зараз забяспечаны 98 % насельніцтва. Да 2025-га мяркуем скончыць гэтую работу — збудаваць яшчэ 81 станцыю ў буйных населеных пунктах, а ў невялікіх мястэчках, з колькасцю жыхароў да 150 чалавек, — яшчэ 150 міні-станцый абезжалезвання (яны малой вытворчасці, аднак не такія дарагія, як класічныя станцыі). Тады ўсе жыхары Віцебшчыны, у тым ліку сяльчане, будуць атрымліваць якасную пітную ваду.*

Сярод іншых задач воднікаў вобласці на найбліжэйшы час — будаўніцтва шасці ачышчальных збудаванняў, замена каля 350 кіламетраў сетак водазабеспячэння і 50 кіламетраў — водаадвядзення.

Пасля абмеркавання праблем воднай гаспадаркі і прапаноў па іх вырашэнні ўдзельнікі семінара азнаёміліся з вопытам забеспячэння якаснай вадой малых населеных пунктаў вобласці і практыкай выкарыстання асадкаў сцёкавых вод. Гэта эксплуатацыя міні-станцыі абезжалезвання на водазаборы ў вёсцы Дабрэйка Віцебскага раёна. Вытворчасць яе — 4 м³/гадзіну. Падобных станцый у вобласці 54, аднак яны больш кампактныя, устанаўліваюцца ў павільёне свідравіны і маюць меншую вытворчасць. Гэта найбольш аптымальны варыянт для забеспячэння пітной вадой населеных пунктаў да 100 чалавек.

Каб забяспечыць людзей вадой у мястэчках ад 10 да 15 чалавек, выкарыстоўваюць прынцып падвозу вады. Гэта ёмістасць аб'ёмам 5 м³, ваду ў якую падвозіць машына, калодзеж з помпай і водаразборная калонка. Эксплуатаваць яе можна круглы год як асноўную крыніцу водазабеспячэння, а таксама пры аварыях. Практыкуюць тут і абезжалезванне вады ў ваданосным пласце, для чаго патрэбны дзве свідравіны.

А асадкі сцёкавых вод гарадскіх ачышчальных збудаванняў, якіх у Віцебску штогод утвараецца каля 30 тысяч тон, віцябляне з 2021 года кампастуюць. Такая ўтылізацыя памяншае аб'ём адходаў і дазваляе штогод выпрацоўваць 24 тысячы м³ гатовага кампосту, які выкарыстоўваецца для азелянення, раслінаводства, лесааднаўлення, засыпкі кар'ераў.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# ШАНЦЫ СТАЦЬ СТУДЭНТАМ ПАВЫШАЮЦЦА...

## ПЕРСПЕКТЫВЫ ДЛЯ ПЕРАМОЖЦАЎ АЛІМПІЯД

Так, паводле новых Правіл прыёму, без уступных іспытаў маюць права паступаць у ВНУ пераможцы міжнародных алімпіяд і рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзенай Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, які завяршыўся ў год прыёму (уладальнікі дыпломаў I, II і III ступеняў). Іх чакаюць на спецыяльнасцях, для якіх дадзены вучэбны прадмет вызначаны першым ці другім прадметам профільнага іспыту, за выключэннем спецыяльнасцяў «Міжнародныя адносіны», «Міжнароднае права», «Правазнаўства», «Эканамічнае права», «Дзяржаўнае кіраванне і права» і «Лінгвакраіназнаўства».

Трэба заўважыць, што **раней пераможцы рэспубліканскай алімпіяды маглі арыентавацца толькі на першы профільны прадмет. Цяпер жа выбар для іх значна пашырыўся**. А пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд па інфарматыцы і астраноміі змогуць паступаць без экзаменаў на групы спецыяльнасцяў «Матэматычныя навукі і інфарматыка», «Фізічныя навукі» і профіль адукацыі «Тэхніка і тэхналогіі».

Без уступных іспытаў змогуць паступаць у творчыя ВНУ пераможцы (уладальнікі Гран-пры, дыпломаў I, II і III ступеняў) міжнародных і рэспубліканскіх творчых конкурсаў і фестываляў, алімпіяд у сферы культуры, праведзеных у год прыёму або ў годзе, які папярэднічае году прыёму. Пералік конкурсаў і фестываляў вызначаецца Міністэрствам культуры па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі. Гэта катэгорыя абітурыентаў паступае без экзаменаў на спецыяльнасці кірункаў «Мастацтва выяўленчае. Мастацтва дэкаратыўна-прыкладное», «Мастацтва музычнае», «Мастацтва сцэнічнае і экраннае», «Народная творчасць», якія адпавядаюць намінацыям творчых конкурсаў і фестываляў або алімпіяд у сферы культуры.

Паступаць без экзаменаў ёсць магчымасць і ў абітурыентаў, узнагароджаных у год прыёму або ў працягу двух гадоў, якія папярэднічаюць году прыёму, нагрудным знакам «Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы здольных навучэнцаў і студэнтаў» за высокія дасягненні ў асобных прадметных сферах, якія адпавядаюць выбранай спецыяльнасці. Аналагічная прывілея ёсць і ва ўладальнікаў нагруднага знака «Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі», калі іх творчыя дасягненні ў сферы культуры адпавядаюць абранаму профілю (кірунку) адукацыі.

Правы паступлення без экзаменаў атрымалі і пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў прафесійнага майстэрства (дыпломы I, II і III ступеняў) у адпаведнасці з пералікам, які ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі, калі тыя праводзіліся ў год прыёму або ў годзе, які папярэднічае году прыёму. Галоўнае, каб кампетэнцыя, у якой яны дасягнулі высокага выніку, адпавядала абранаму профілю (кірунку) адукацыі.

Ёсць прывілеі і ў пераможцаў (дыпломы I, II, III ступеняў) трэцяга (абласнога і Мінскага гарадскога) этапаў рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзенай у бягучым навучальным годзе. Яны могуць без экзаменаў паступаць у рэгіянальныя ВНУ на спецыяльнасці, для якіх дадзеныя вучэбны прадмет вызначаны прадметам профільнага іспыту (за выключэннем спецыяльнасцяў «Міжнародныя адносіны», «Міжнароднае права», «Правазнаўства», «Эканамічнае права», «Дзяржаўнае кіраванне і права», «Лінгвакраіназнаўства»).

Такім чынам, поспех на абласным этапе дае права залічэння без экзаменаў у абласныя ВНУ, на рэспубліканскім — ва ўсе без выключэння.

## ПЕДАГАГІЧНЫЯ І ВОСТРА ЗАПАТРАБАВАНЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Пры паступленні на найбольш запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці без уступных іспытаў будуць залічвацца пераможцы (уладальнікі дыпломаў I, II і III ступеняў) трэцяга (абласнога і Мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзенай у навучальным годзе, які завяршыўся ў год прыёму, школьныя медалісты, уладальнікі дыпломаў аб сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі з адзнакай.



Фота Лізаветы ГОПАД.

Пералік найбольш запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцяў быў вызначаны пастановай Міністэрства адукацыі. Ёсць два пералікі: для падрыхтоўкі спецыялістаў на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. У пералік найбольш запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцяў, па якіх рыхтуюць у ВНУ, увайшлі 53 спецыяльнасці: «Дашкольная адукацыя», «Камп'ютарная фізіка», «Матэматыка», «Радыёсістэмы і радыётэхналогіі», «Аўтамабілі, трактары, мабільныя і тэхналагічныя комплексы», «Нанатэхналогіі і нанаматэрыялы», «Інжынерна-педагагічная дзейнасць», «Тэхналогіі і праектаванне адзення і абутку», «Меліярацыя і водная гаспадарка», «Водныя біярэсурсы і аквакультуры», «Ветэрынарная медыцына» і іншыя.

Па-за конкурсам на месцы на найбольш запатрабаваных спецыяльнасцях могуць залічвацца ўдзельнікі заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, узнагароджаныя пахвальным водгукам, і асобы, якія прайшлі тэрміновую ваенную службу і маюць рэкамендацыі воінскіх часцей ці органаў пагранічнай службы, калі яны паступаюць на завочную форму атрымання адукацыі. І першыя, і другія павінны мець у дакуменце аб адукацыі адзнакі не ніжэй за «6» балаў па прадметах уступных выпрабаванняў.

У школьных медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адзнакай ёсць права паступаць без здачы экзаменаў (пры наяўнасці рэкамендацыі педагагічнага савета ўстановы адукацыі, якую яны скончылі) на педагагічныя спецыяльнасці, пералік якіх устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі.

Таксама на педагагічныя спецыяльнасці без уступных іспытаў могуць паступаць пераможцы трэцяга (абласнога і Мінскага гарадскога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, калі дадзены вучэбны прадмет быў вызначаны прадметам профільнага іспыту. Ім таксама трэба мець рэкамендацыю педагагічнага савета ўстановы адукацыі, якую яны скончылі.

Выпускнікі профільных педагагічных класаў і груп паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці без экзаменаў па гутарцы пры захаванні наступных умоў: у дакуменце аб адукацыі — адзнакі не ніжэй за «8» балаў па вучэбных прадметах, якія адпавядаюць прадметам профільных выпрабаванняў, і адзнакі, не ніжэйшыя за «7» балаў, — па ўсіх астатніх вучэбных прадметах. Таксама яны павінны мець рэкамендацыю педагагічнага савета ўстановы, якую скончылі, і быць гатовымі пасля заканчэння навучання адпрацаваць па размеркаванні не менш як пяць гадоў у сістэме адукацыі.

На такіх жа ўмовах змогуць паступаць на групу спецыяльнасцяў «Фізічная культура і спорт» і «Падрыхтоўка педагогаў у галіне фізічнай культуры» абітурыенты, якія прайшлі навучанне ў профільных класах і групах спартыўна-педагагічнай накіраванасці. Яны таксама павінны быць гатовыя пасля атрымання вышэйшай адукацыі адпрацаваць па размеркаванні не менш як пяць гадоў.

Таксама без выпрабаванняў на завочную форму навучання ў ВНУ змогуць паступіць абітурыенты, якія атрымалі сярэднюю спецыяльную педагагічную адукацыю, калі яны плануюць працягваць навучанне на педагагічнай спецыяльнасці ў вышэйшай школе.

## СУВОРАЎЦЫ, КАДЭТЫ І ЛІЦЭІСТЫ

Шэраг ільгот прадугледжаны і для тых, хто будзе паступаць у ВНУ сілавых ведамстваў. Так, без экзаменаў будуць паступаць выпускнікі Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча, якія скончылі ў год паступлення дадзеную ўстанову з адзнакамі «7» і вышэй балаў па ўсіх прадметах вучэбнага плана і былі накіраваныя ў рамках плана размеркавання суворaўцаў для далейшага навучання ва ўстановы вышэйшай адукацыі Міністэрства абароны, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта і на ваенныя факультэты (ваенны інстытут).

Выпускнікі Спецыялізаванага ліцэя пры Універсітэце грамадзянскай абароны Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Спецыялізаванага ліцэя Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і кадэцкіх вучылішчаў, якія скончылі ў год паступленні дадзеныя ўстановы з адзнакамі «7» і вышэй балаў па ўсіх прадметах навучальнага плана, без уступных іспытаў паступаюць у вышэйшыя навучальныя ўстановы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства абароны і на ваенныя факультэты (акрамя спецыяльнасцяў для органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю), у колькасці да 30 працэнтаў ад кантрольных лічбаў прыёму.

У гэтым годзе з'явіліся яшчэ дзве новыя катэгорыі абітурыентаў, якім дадзена права паступаць у ВНУ без уступных іспытаў. Выпускнікі трох ліцэяў (Ліцэя БДУ, Ліцэя Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта і Ліцэя Беларуска-Расійскага ўніверсітэта), якія маюць у дакуменце аб адукацыі адзнакі не ніжэй за «9» балаў па вучэбных прадметах, што адпавядаюць прадметам профільных іспытаў, і адзнакі не ніжэй за «8» балаў па ўсіх астатніх вучэбных прадметах, будуць залічаны ў адпаведныя ВНУ без экзаменаў.

Не трэба будзе здаваць іспыты ў ВНУ і навучэнцам Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, калі яны абяруць профілі «Тэхніка і тэхналогіі» і «Прыродазнаўчыя навукі». Абітурыенты павінны прайсці навучанне ў тэхнапарку ў тым жа навучальным годзе, у якім плануюць паступаць у ВНУ. Таксама ім спатрэбіцца рэкамендацыя ад назіральнага савета тэхнапарка.

## ЧАМУ ЦТ ЛЕПШ НЕ ПРАПУСКАЦЬ?

У Міністэрстве адукацыі падкрэсліваюць, што ўсе навелы ў парадку адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет абумоўлены духам часу і тымі працэсамі, што адбываюцца ў эканоміцы і ў сістэме адукацыі. Гэта і новыя асаблівыя падыходы да мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў, якая, па сутнасці, з'яўляецца найбольш эфектыўнай формай заказу кадраў.

У 2023 годзе ў сілу ўвойдуць нормы аб павелічэнні ва ўстановах вышэйшай адукацыі гранічных квот у рамках мэтавай падрыхтоўкі: па сельскагаспадарчых спецыяльнасцях — да 70 працэнтаў ад кантрольных лічбаў прыёму, па медыцынскіх — да 80 працэнтаў і па іншых — да 60 працэнтаў.

Трэба разумець, што 60, 70 і 80 працэнтаў — гэта максімальная планка. Ці знойдзецца столькі заказчыкаў, гатовых пралічыць свае патрэбы ў кадрах на чатыры-пяць і больш гадоў наперад, мы даведаемся ўжо вельмі хутка. Гэтыя лічбы павінны быць даведзены да 1 мая. Адпаведная інфармацыя і інфармацыя аб заказчыках кадраў, з якімі можна будзе ў маі заключаць дагаворы, з'явіцца на сайтах вышэйшых навучальных устаноў.

Яшчэ адзін важны нюанс: тэрміны паступлення на мэтавую падрыхтоўку змяніліся. Залічэнне завершыцца яшчэ да старту ў краіне цэнтралізаванага тэсціравання. З гэтага года прэтэндэнты на мэтавую падрыхтоўку будуць здаваць унутраны экзамен па першым профільным прадмеце. Выпрабаванне пройдзе ў вуснай форме, акрамя спецыяльнасцяў творчага напрамку, а таксама звязаных са спортам, фізічнай культурай і шэрагу іншых. На сайце Міністэрства адукацыі можна знайсці пытанні да экзамену: іх 50 па кожным прадмеце.

І напрыканцы парада ўсім: варта мець на ўвазе, што колькасць бюджэтных месцаў фарміруецца зыходзячы з патрэб эканомікі. І абітурыентаў, якія карыстаюцца тымі ці іншымі прывілеямі, можа быць больш, чым гэтых месцаў. Таму ўсім катэгорыям абітурыентаў (і медалістам, і выпускнікам ліцэяў, і навучэнцам педагагічных класаў) лепш усё ж прайсці ЦТ для пашырэння магчымых траекторый для паступлення. Актуальная гэта рэкамендацыя і ў тым выпадку, калі асаблівыя ўмовы распаўсюджваюцца пры паступленні на пэўныя спецыяльнасці. Скажам, выпускнікі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка паступаюць без іспытаў толькі на два профілі. А пры жаданні навучацца па іншай спецыяльнасці ім таксама трэба здаваць ЦТ... Тое ж можна параіць і абітурыентам, якія плануюць паступаць на мэтавыя месцы. Калі абітурыенты не пройдуць па конкурсе (а такое магчыма, калі на адно месца будзе прэтэндаваць некалькі чалавек), яны змогуць паспрабаваць свае сілы пры паступленні на бюджэтную або платную формы навучання. Для гэтага выпускнікам бягучага года неабходна будзе здаць адзін прадмет на ЦТ, таму для падстрахоўкі ў маі на яго варта зарэгістравацца, каб не ўпусціць сваю магчымасць стаць студэнтам сёлета.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАДПІСАЎ УКАЗ № 109 «АБ КАНТРОЛІ ЗА ПРАВЯДЗЕННЕМ УСТУПНАЙ КАМПАНІІ»

Згодна з дакументам, у краіне створана дзяржаўная камісія па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўсіх этапаў уступнай кампаніі ў 2023 годзе, уключаючы цэнтралізаваны экзамен у рамках выніковай атэстацыі за курс сярэдняй школы.

Старшынёй камісіі прызначаны намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка, а ў яе склад уключаны члены Савета Рэспублікі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, кантралюючых органаў і грамадскіх арганізацый.

Уведзены рознаўзроўневы кантроль за ўступнай кампаніяй і персанальная адказнасць кіраўнікоў дзяржорганаў і мясцовай вертыкалі. Камітэт дзяржаўнага кантролю адказны за выкананне заканадаўства пры падрыхтоўцы і правядзенні ўступнай кампаніі. Прадстаўнікі дзяржорганаў, грамадскіх аб'яднанняў і педагагічныя работнікі — за экзамены непасрэдна ва ўстановах адукацыі.

Рэалізацыя ўказа дасць магчымасць забяспечыць абарону правоў і законных інтарэсаў грамадзян пры паступленні ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, прыняць у выпадку неабходнасці аператыўныя меры рэагавання для выключэння парушэнняў заканадаўства.

Ведай нашых!

# Ён мог загінуць даўно і нават не раз,
## але адзначыў сваё стагоддзе!

**У ваенных дакументах стагадовага Алега Назаравіча Пліндова захаваліся выпіскі з загада па 195-м гвардзейскім артылерыйскім палку 91-й гвардзейскай Духаўшчынскай дывізіі. Адна з іх аб тым, што Пліндоў з рызыкай для жыцця пад агнём праціўніка правёў прывязку нязіральных пунктаў і агнявых пазіцый дывізіёна і штаба батарэі, другая — што, дзякуючы яго дакладнай карэкціроўцы, агню ўдалося падавіць апорны пункт немцаў, трэцяя — што працягнуў тэлефонную лінію... — Гэта была мая звычайная франтавая работа, — кажа Алег Назаравіч і, крыху памаўчаўшы, дадае: — Нічога не зробіш — вайна...**

Для студэнта Магілёўскага педінстытута яна пачалася з паходу ў ваенкамат, з просьбы запісаць яго дабраахвотнікам, з павесткі з'явіцца на прызыўны пункт. З 12 ліпеня хлопец-франтавік стаў весці дзённік.

### «Тут праўда і толькі праўда», —

папярэджвае ветэран.

— Усё, што бачыў, што перажываў, я стараўся запісваць.

Чытаем разам: «Бесталкова рухаліся па Смаленскай вобласці. Ішлі, ехалі прасёлачнымі дарогамі. Затым — панічна пабеглі: начальнікам усюды мроіліся дыверсанты...»

«У паветры толькі нямецкія самалёты. На вачах, трохі збоку, бесперапынныя бамбёжкі».

«На станцыях — саставы. У адным, насупраць нашых казарм, — спірт, і вартавы нічога не можа зрабіць, страляе ў паветра. Хлопцы вёдрамі, кацялкамі носяць спірт...»

«На пярэдні край абароны на світанні наляцелі варожыя аўтаматчыкі. Атака была адбіта... Давялося ўбачыць магутны налёт нашай артылерыі...»

«Уступіў у камсамол. Пры мне прымалі кандыдатамі ў партыю. З 25 чалавек ніводзін не назваў усіх пастоў Сталіна. Паўшчуваюць, напэўна, і прымуць пазней...»

«Выдалі вінтоўкі, імператарскія, выпуск 1905 года...»

### Смерць ішла па пятах

Але ж хлопцам давялося не толькі ваяваць: ладная група з выпускнікоў школ і студэнтаў стала курсантамі Варонежскага вучылішча сувязі. Праз паўтара месяца менавіта іх, «зялёных», каля горада Яльца кінулі супраць узброеных да зубоў немцаў. Адбіваліся звычайнымі вінтоўкамі і гранатамі. Страты былі жахлівыя. Алег, шчыра кажучы, не спадзяваўся выжыць, але яму пашчасціла.



Прычым не толькі тады. На Валдаі атрымаў загад тэрмінова даставіць важнае данясенне ў штаб палка, які размяшчаўся досыць далёка. Аднак баец ведаў, што гэты шлях можна скараціць, калі метраў семдзесят адолець пад прыцэльным агнём снайпераў.

Ну, вядома ж, рызыкуючы, то хаваючыся за дрэвамі, то ныраючы ў кусты і варонкі ад снарадаў, Алег Пліндоў, пачаў кароткія перабежкі і такі абдурыў ворага!

Далейшая дарога ляжала ўздоўж шумлівай рачулкі, за паваротам байцу трэба было перайсці яе. Але ж спачатку, ратуючы ад вады аўтамат, Алег перавесіў яго за плечы. І амаль тут жа яе быццам спатыкнуўся...

На процілеглым беразе, зняўшы зброю, убачыў, што смерць ішла за ім па пятах: прыклад аўтамата быў расколаты разрыўной куляй...

Пашчасціла байцу і ў вулічных баях у горадзе Вялікія Лукі, калі побач, за нейкія тры-чатыры метры ўпаў, але не ўзарваўся снарад буйнога калібру, калі ўжо на радзіме, пад Лёзна, ён адлучыўся з назіральнага пункта, каб набраць крынічнай вады, і, азірнуўшыся, убачыў, што той пункт у адно імгненне знішчаны гарматным залпам. Два чалавекі тады загінулі, Алега толькі кантузіла.

...Іншымі словамі, шмат выпрабаванняў чакала байца на франтавых дарогах: на яго вачах гінулі аднапалчане і найлепшыя сябры, а вясной 1944-га пад Віцебскам ён быў цяжка паранены сам. Тры месяцы тады правёў у палявых шпіталях, інвалідам вярнуўся дамоў у Круглянскі раён.

### «У сваім педкалектыве я быў ледзь не прафесарам!»

У райкаме партыі яму, 23-гадоваму, прапанавалі стаць дырэктарам Цяцерынскай сямігодкі. «Не па Сеньку шапка. Лепей на дзот», — сказаў ён сакратару. — «Ну давай тады хоць намеснікам — па ваенна-спартыўнай рабоце?» Пліндоў згадзіўся і пачынаў з таго, што да новага навучальнага года рыхтаваў саму школу.

З дапамогай сельсавета ўдалося арганізаваць рамонт класаў, а паралельна — «вытворчасць» лавак і вучнёўскіх сталоў. «З адным курсам інстытута я ў педкалектыве быў ледзь не прафесарам, — успамінае ветэран. — Мяркуйце самі: беларускую мову выкладала выпускніца вячэрняй школы, нямецкую — пажылая яўрэйка, матэматыку — камісаваны сапёр»...

Менавіта ў школе Алега Назаравіча заспела вестка аб Перамозе. «Мы адразу ж разаслалі вучняў па навакольных вёсках, запрасілі ўсіх прыйсці на мітынг, — успамінае ветэран. — Самі вывесілі на ганку чырвонае палотнішча, вынеслі партрэт Сталіна... Былі выступленні, хапала слёз і ад радасці, і ад гора».

Інстытут Алег Назаравіч скончыў завочна, больш за паўвека працаваў на ніве народнай адукацыі. Ён ветэран педагагічнай працы, адзначаны медалём «За працоўную доблесць».

### «Я б мог пагібнуць в сорок третьем...»

Верш з такім радком баец Пліндоў напісаў у той дзень, калі варожая куля раструшчыла прыклад аўтамата.

А паэзіяй стаў захапляцца яшчэ ў школе, друкаваўся ў абласной газеце, разам з іншымі паэтамі-пачаткоўцамі меў шчасце прачытаць свае творы нашым класікам Янку Купалу і Якубу Коласу, падзівіцца іх даступнасці, іх прастаце ў зносінах з людзьмі.

На вайне Алег Пліндоў пісаў нататкі і лірычныя вершы, досыць вострую сатыру на Гітлера ды яго паплечнікаў у дывізіённую газету. І як жа ўзрадаваўся, калі яго запрасілі на сустрэчу з ваенным карэспандэнтам і паэтам Аляксандрам Твардоўскім!

Аўтар славутай паэмы «Васіль Цёркін» расказаў тады, як яна ствараласа, быў усцешаны тым, што многія байцы носяць твор у сваіх заплечніках, чытаюць па памяці.

Пацікавіўся Твардоўскі і тым, ці ёсць сярод байцоў беларусы? Алег і яшчэ некалькі хлопцаў паднялі рукі. Паэт павітаў іх, паганарыўся тым, што яго дзядуля родам з Магілёўскай губерні.

...З 2002 года ветэран жыве ў Гомелі, часта выступае перад школьнікамі, навучэнцамі гімназій і каледжаў, перад студэнтамі, чытачамі бібліятэк. Ён узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны, двума медалямі «За адвагу».

### «Сакрэты» ветэрана Пліндова

***— Алег Назаравіч, у вас за плячыма досыць пакручастая стогадовая дарога. Ёсць, магчыма, нейкія сакрэты ў вашым доўгажыхарстве?*** — пытаю на развітанне.

— Не, ніякіх! Я проста заўсёды верыў у сябе і баяўся цяжкасцяў, нікому ні ў чым не зайздросціў, не пераходзіў дарогу, стараўся рабіць дабро і не спрачацца з дурнямі (ім жа ўсё роўна нічога не дакажаш!).

**Запісаў Уладзімір Пернікаў,**
*г. Гомель.*

След на зямлі

# «НЯСПЫННЫ БЕГ, ШАЛЁНЫ БЕГ. ЁН З КОЖНЫМ ГОДАМ НАРАСТАЕ...»

**Каб зачапіць, зацікавіць чытача ўстрывожаным (у гэтым выпадку) «Што ж далей?», вершу мала быць дасканалым па форме — ён павінен быць шчырым па змесце, а пісаць так могуць, на жаль, не многія. Наш зямляк Мар'ян Дукса здолеў.**

Сёлетняй вясной ён — аўтар больш чым дзясятка паэтычных зборнікаў, лаўрэат літаратурных прэмій, ганаровы грамадзянін Смаргонскага раёна — адзначыў бы 80. Але сышоў раней: сышоў (як, дарэчы, і жыў...) ціха ды незаўважна. І таму, вядома ж, застаўся мудрым настаўнікам, верным захавальнікам роднай мовы.

Асабісты вопыт спасціжэння Бога, занепакоенасць лёсам народа, нацыянальнай культуры, Айчыны, любоў да чалавека, якая перамагае ўсё — вось асноўныя лейтматывы большасці вершаў. Адчуванне сваёй мізэрнасці ў Сусвеце («Ці ўзвысіцца мой кволы галасок над гімнамі пушчанска-баравымі?») і адначасова аптымістычная ўпэўненасць у сіле чалавечага духу («Агонь твой не, не дагарыць, // яшчэ пасвеціць яркай зоркаю. // Ты праўду будзеш гаварыць — салодкую ці вельмі горкую»), канстатацыя сваёй бездапаможнасці перад націскам гвалту («Навокал пакуты, на пласе — галовы...») і пратэст супраць бездухоўнасці («А сыплецца з вачэй людскіх гарох, // як пачынаюць спрэчку фарысеі») чаргуюцца з лірычнымі строфамі і вытанчаным метафарычным гумарам аўтара.

Вельмі шмат у Мар'яна Дуксы рытарычных пытанняў. Імі пачынаюцца ці завяршаюцца многія вершы, асобныя — з іх нават складаюцца:

*Няспынны бег, шалёны бег.*
*Ён з кожным годам нарастае.*
*Што з гэтага? Душа пустая.*
*Што мы ўхапілі? Грэх і смех.*
*Куды пусціліся так хутка?*
*На газ абцасамі — смялей!*
*Хай набягае вёрст накрутка,*
*Тэмп вар'яцее... Што далей?..*

Мар'ян Дукса, разважаючы пра месца паэта ў сучасным свеце, сцвярджае, што вершы не легкадумная пацеха на вясёлай вечарынцы: паэзія як сястра філасофіі павінна вучыць жыццю па самых высокіх мерках чалавечай адказнасці, быць паходняй, што асвятляе дарогу праз змрок, быць духоўнай ежай, што сілкуе розум маладым і надае душэўнай раўнавагі сталым.

**Ала Страшынская,**
*г. Смаргонь.*

**Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» глыбока смуткуе з прычыны смерці былога супрацоўніка газеты Алега Канстанцінавіча НІКАЛАЙЧЫКА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

Усмешачку!

# Перад выбарам: пасадзіць ці пасядзець?



Думала схадзіць да сяброўкі ў госці. Тая сказала, каб трохі пазней: сёння няма дзе сесці.

Чалавек — чалавеку

# Любіць — значыць клапаціцца

**Летась на рыбалцы мне вельмі пашчасціла: са спінінгам ішоў па беразе Нёмана і ўбачыў шчупака. Ён застыў у траве на мелкаводдзі, ён цалкам зліваўся з зеленкаватай афарбоўкай раслін, але ж я заўважыў яго!**
**Тут жа ў хлопчыка-вяскоўца, што рыбачыў непадалёк, выпрасіў акунька, насадзіў на трайнік — падкінуў шчупаку пад нос. Разлічваў, што ён адразу клюне! Аж не: нуль увагі...**
**Карацей, не так хутка, як спадзяваўся, але ж рыбіну я злавіў! Трохі патрымаў на беразе, палюбаваўся яе прыгажосцю і адпусціў назад у ваду.**

Не ўсе, напэўна, мяне зразумеюць, але я скажу, што для мяне, шчырага і даўняга аматара рыбалкі, галоўнае — зусім не ўлоў, а сам працэс, само сузіранне прыгажосці і велічы прыроды. Пах травы і вады, спевы птушак, усход і заход сонца, месяцы і часіны, калі ўдыхаеш не столькі паветра, колькі само шчасце!

Цэлымі гадзінамі я магу прападаць на нейкім беразе, сядзець і глядзець на паплавок. А калі яшчэ і паклёўка...

Не бяруся казаць за іншых, — мне таксама яшчэ болей хочацца жыць, яшчэ мацней любіць сваю краіну, сваю зямлю.

І для мяне, паверце, гэта зусім не гучныя словы, а найперш справы, бо, па вялікім рахунку, любіць — значыць клапаціцца.

Мой дзядуля некалі казаў, што ў лесе ўсе дрэвы розныя, а ў жыцці — УСЕ людзі.

З гэтым і сапраўды не паспрачаешся: ёсць, на жаль, тыя, што грабуць пад сябе ўсё, што трэба і нават не трэба, і тым самым непапраўна шкодзяць зямлі. Хто іх можа спыніць? Міліцыя? Рыбнагляд? Інспекцыя па ахове прыроды?

Можна спадзявацца на іх, але ж трэба і нам, людзям свядомым, не саромецца — рабіць заўвагі «сейбітам» розная смецця і браканьерам, правільна выхоўваць сваіх дзяцей і ўнукаў, даводзіць ім спрадвечны дэвіз сапраўдных рыбакоў: злавіў рыбу — адпусці! І ты не пашкадуеш.

**Аляксандр Карчэўскі,**
*г. Навагрудак.*

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

19 красавіка 2023 г. № 14 (700)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ЧАС МАЛАДЫХ

# АД «НАСТОЛАК» ДА БЛОГЕР-СТУДЫІ

## Як развіваюцца ініцыятывы Маладзёжнага парламента ў Навагрудку

**У скарбонцы маладых парламентарыяў нямала цікавых праектаў. Трэба сказаць, што прапановы моладзі не застаюцца без увагі. Як правіла, яе ідэі абмяркоўваюцца ў фармаце адкрытага дыялогу з органамі мясцовай улады. А вось рэалізацыя залежыць збольшага ад самой моладзі і дапамогі педагогаў.**



### ВЯРТАННЕ ПАМЯЦІ

Адным з самых значных такіх праектаў стаў вялікі выставачны комплекс-макет «Сёстры Хатыні». Праект стартаваў як даследчая работа старшакласнікаў сумесна з органамі пракуратуры. У выніку паўстала нямала новых фактаў, звязаных з генацыдам беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Калі ў пачатку даследавання было вядома аб 16 вёсках Навагрудскага раёна, спаленых часткова або поўнасцю, то пасля заканчэння работы ўстаноўлены 44 такія вёскі. На аснове гэтых матэрыялаў узнікла ідэя ўвасобіць населеныя пункты ў вялікі выставачны комплекс. Прапанова дэпутатаў Маладзёжнага парламента знайшла водгук у вучнёўскім асяроддзі.

— Сумесны праект з пракуратурай доўжыўся больш за год, прыйшлося папрацаваць у архівах, знайсці відавочцаў тых падзей, каб змадэляваць вёску і зрабіць яе макет, — прыгадала **дэпутат Маладзёжнага парламента пры Навагрудскім раённым Савеце дэпутатаў Кацярына САПЕГА**.

Дзяўчына вучыцца ў СШ № 3 імя В. Г. Гаховіч. Школа носіць імя былой настаўніцы, заслужанага педагога, ганаровай грамадзянкі раёна. Ды і сама Кацярына не толькі паспяхова вучыцца, але і актыўна ўдзельнічае ў жыцці горада і гатовая падтрымаць усе прагрэсіўныя ініцыятывы. Праект «Сёстры Хатыні» — адна з іх. Рукамі зроблены макет вёскі Заполле, дзе была спалена 15 сядзіб, а сама вёска — разрабавана.

— Тут усё зроблена з прыродных матэрыялаў, кардону, іншых падручных сродкаў, — расказвае Каця. — Калі творыш, нібы прапускаеш праз сябе тыя падзеі, уяўляеш той падворак, калодзеж, дом, разумееш, што там жылі людзі, гулялі дзеці, а затым такая трагедыя, гэта вельмі чапляе...

За год створаны дзясяткі макетаў. Была нават арганізавана іх выстава на плошчы Навагрудка, людзі падыходзілі, цікавіліся. Часткова экспазіцыя захоўваецца ў школах раёна і Цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Разам з іншымі экспанатамі макеты ўваходзяць у экспазіцыю, прысвечаную генацыду. **Дырэктар цэнтра Алена МІКЛАШ** расказала, што супрацоўнікамі ўстановы распрацаваны экскурсіі, а матэрыялы даследаванняў органаў пракуратуры ўвайшлі ў зборнік, распаўсюджаны па ўстановах адукацыі. Кажуць, што пошукавую дзейнасць тут будуць працягваць.

Вядуцца даследаванні і ў гістарычным плане. Менавіта падчас сустрэчы дэпутатаў Маладзёжнага парламента з кіраўніцтвам горада з'явіўся праект па ўвасабленні гістарычных назваў вуліц старажытнага Навагрудка. Ідэю падтрымалі ў турысцка-інфармацыйным цэнтры. Такім чынам, на сямі вуліцах былі ўстаноўлены шыльды з гістарычнымі назвамі на некалькіх мовах.

### ПАГУЛЯЕМ У «ВАСІЛЬКОВУЮ БЕЛАРУСЬ»

У Навагрудку пачалі развіваць гульні-«настолкі». Апошнім часам гэты кірунак становіцца папулярным у моладзі з-за яго пазнавальнага характару.

***(Заканчэнне на 8-й стар.)***






ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Павысіць эфектыўнасць будаўнічай галіны



**Пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ прайшло чарговае пасяджэнне экспертнага савета. Сярод пытанняў — праект Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці. Наталля Качанава назвала гэта пытанне вельмі важным для ўсіх. «Вы ведаеце, якая ўвага ўдзяляецца ў нашай краіне будаўнічай галіне. Сапраўды, былі розныя перыяды ў яе развіцці. Нам вельмі важна гэтую галіну захаваць і развіваць, бо гэта перспектыва развіцця краіны. Дадзены законапраект доўга абмяркоўваецца, разглядаўся на рознага ўзроўню нарадах, таму сёння мы павінны даць сваё экспертнае заключэнне кіраўніку дзяржавы», — падкрэсліла спікер. Таксама яна звярнула ўвагу на тое, што неабходна падтрымаць спецыялістаў, прыцягнуць кадры да работы ў будаўніцтве.**

Як сёння развіваецца айчынная будаўнічая галіна і якія перад ёй стаяць выклікі, журналістам расказаў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня Навапалацкага гарвыканкама Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ**. «Будаўнічая галіна ў Рэспубліцы Беларусь — адна з ключавых, якія вызначаюць у сферы эканомікі, мае стратэгічнае значэнне для ўсіх астатніх галін народнай гаспадаркі. Суб'ектамі будаўнічай дзейнасці з'яўляюцца органы дзяржаўнага кіравання, юрыдычныя, фізічныя асобы, фактычна ўсе мы, усе жыхары Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца ўдзельнікамі будаўнічай дзейнасці. Таму распрацоўка нарматыўных дакументаў, тым больш такога асноватворнага, як кодэкс, безумоўна, павінна абапірацца на меркаванні абсалютнай большасці ўдзельнікаў будаўнічай дзейнасці», — сказаў ён. Па словах Дзмітрыя Дзямідава, падчас работы над адпаведнымі законапраектамі, над кодэксам аб архітэктурна-будаўнічай дзейнасці ўлічваюцца меркаванні фактычна ўсіх удзельнікаў будаўнічай дзейнасці, экспертаў заканадаўчай дзейнасці. Па словах сенатара, такая форма работы паказвае сваю эфектыўнасць. Таму што ўлічваюцца досвед і веды непасрэдна кіраўнікоў будаўнічых арганізацый, тых удзельнікаў будаўнічай дзейнасці, якія адказваюць за тэхнічны нагляд, праектаванне і, безумоўна, спажыўцоў будаўнічай дзейнасці. «Шмат праходзіла сустрэч не толькі ў Мінску, але і з выездам у рэгіёны, праходзілі вельмі гарачыя дыскусіі, было ўнесена вельмі шмат паправак у першапачатковы праект кодэкса. На дадзены момант, вядома, дакумент выкрышталізоўваецца, ён аб'ядноўвае вельмі шмат паняційных тэрмінаў. Важна, што гэты нарматыўны дакумент вызначае прынцыпы інавацыйнага развіцця будаўнічай галіны, укараненне лічбавых тэхналогій, уніфікацыю праектнай дакументацыі.

Безумоўна, гэта ўсё заклікана спрасціць правядзенне будаўнічых работ, павысіць эфектыўнасць будаўнічай галіны, дае магутны стымул для інавацыйнага, наступнага эфектыўнага развіцця і ўкаранення самых сучасных тэхналогій як у галіну будаўніцтва, так і ў галіну тэхнічнага нагляду, наступнай эксплуатацыі будаўнічых аб'ектаў, якія ўзводзяцца», — расказаў Дзмітрый Дзямідаў.

# АД «НАСТОЛАК» ДА БЛОГЕР–СТУДЫІ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 7–й стар.)*

Да таго ж, як і ў кожнай гульні, ёсць магчымасць выйсці ў лідары, прадэманстраваць эрудыцыю і дасведчанасць. Такіх гульняў навагрудскія парламентарыі сумесна са сваімі сябрамі прыдумалі некалькі. Ёсць тут, напрыклад, гульня па мэтах устойлівага развіцця тэрыторый. Але найбольшую зацікаўленасць выклікала патрыятычная «Васількова Беларусь», якая распрацавана сумесна з Цэнтрам дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Гульня скіравана на тое, каб больш ведаць аб гарадах. Гэта макеты з картай, якая складаецца з пазлаў.

— Праз QR-коды дзеці заходзяць на інтэрнэт-рэсурсы, атрымліваюць інфармацыю,— тлумачыць Алена Міклаш. — Напрыклад, выхадным пунктам Навагрудка з'яўляецца дзень вызвалення нашага горада, далей мы даведваемся сімволіку, герб, славутасці, вядомых асоб і развіваемся ў кірунку вывучэння роднага краю. Кідаем фішку, выцягваем пытанне і адказваем.

Праект быў прадстаўлены на конкурсе маладзёжных ініцыятыў і ў рамках абласнога праекта Беларускага саюза жанчын «Крылы памяці» заняў першае месца ў краіне. Сродкі за перамогу пайшлі на фінансаванне прома-прадукцыі. Гульня распаўсюджваецца, кажуць распрацоўшчыкі. Ужо рэалізаваны заказ ад РАУС Гродна на 30 камплектаў для правядзення аднаго з іх мерапрыемстваў. Настольныя гульні тутэйшых распрацоўшчыкаў актыўна выкарыстоўваюцца на класных гадзінах, падчас канікулаў.

## МЕЙНСТРЫМ І ПАТРЫЯТЫЧНЫ ДЭСАНТ

— Маладзёжны парламент развіваецца, — гаворыць Кацярына Сапега. — Нас чуе мясцовая ўлада, падтрымлівае, у тым ліку і фінансава. Па магчымасці ў райсавеце дэпутатаў шукаюць партнёраў для рэалізацыі ініцыятыў, што дае нашаму Маладзёжнаму парламенту дадатковы стымул. Сёлета, напрыклад, дэпутат Маладзёжнага парламента Мікіта Авечкін з Навагрудка стаў пераможцам у рэспубліканскім конкурсе «Лідар года — 2022».

Дарэчы, Мікіта, як і яшчэ 12 дэпутатаў Маладзёжнага парламента, з'яўляецца ўдзельнікам блогер-студыі «Мейнстрым», якая створана на базе Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

— Наш праект летась перамог у першым рэспубліканскім конкурсе маладзёжных ініцыятыў, — з гонарам кажа **намеснік дырэктара па вучэбна–метадычнай рабоце цэнтра Святлана КРЫНСКАЯ**. — Студыя атрымала грант у памеры 10,5 тысячы рублёў, які мы выкарысталі для набыцця спецыяльнага абсталявання — камп'ютара, студыйнага святла і іншага. Часткова праект фінансуецца за кошт пазабюджэтных сродкаў. Ініцыятыва развіваецца, у студыі свой блог у тэлеграм-канале. Гэта становіцца брэндам, іміджам горада і раёна. У нас, напрыклад, ёсць рубрыка «Мая Беларусь».



Нядаўна дэпутаты Маладзёжнага парламента з Навагрудка прапанавалі новы праект — патрыятычны дэсант. У райвыканкаме ідэю падтрымалі. На чарзе — стварэнне ініцыятыўнай групы з ліку міжведамасных структур, якая зоймецца распрацоўкай блока тэматычных мерапрыемстваў з вызначаным сцэнарам, дыдактычным матэрыялам, фотавыставамі. Падрыхтаваны дэсант будзе выязджаць ва ўстановы адукацыі. Першы выезд тут плануюць ажыццявіць 9 Мая — на Дзень Перамогі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# «НЕ БЫЦЬ РАЎНАДУШНЫМІ ДА ЛЮБОГА ЗВАРОТУ»

## Актуальныя праблемы ў рабоце з насельніцтвам абмеркавалі члены Прэзідыума Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў падчас выязнога пасяджэння ў Свіслачы

**Лейтматывам размовы можна назваць накіраванасць на паляпшэнне дабрабыту насельніцтва. Такі падыход, уласна кажучы, абумоўлены самім курсам развіцця краіны. У сувязі з гэтым мясцовыя ўлады скіраваны на вырашэнне пытанняў, якія хвалююць жыхароў гарадоў і вёсак. Адпрацаваны самыя розныя формы ўзаемадзеяння — ад сельскіх сходаў да асабістых прыёмаў грамадзян. Удзельнікі пасяджэння выказалі свае прапановы аб тым, як удасканаліць работу са зваротамі грамадзян органаў мясцовага самакіравання.**

Аналіз такой дзейнасці неабходны, падкрэсліла **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА**. Кожны дэпутат час ад часу павінен задаваць сабе пытанне: ці ўсё, што было абяцана падчас перадвыбарчай кампаніі, зроблена? Вядома, вынікі работы ёсць, але ёсць і пытанні, якія яшчэ трэба вырашыць. І тут многае залежыць ад дэпутата, наколькі гэты чалавек актыўны, неабыякавы, аўтарытэтны, здольны ўзяць на сябе адказнасць, як ён супрацоўнічае з органамі ўлады.

— Наша задача, — падкрэсліла Алена Пасюта, — якасна выконваць сваю работу. Самае галоўнае — не быць раўнадушнымі да кожнага звароту. І калі чалавеку патрэбная дапамога, тут мы калегіяльна павінны знайсці магчымасці дапамагчы. У такім кірунку нам варта рухацца і прымаць дакладныя рашэнні. У рэшце рэшт, гэта адзін з важных аспектаў паляпшэння ўзроўню жыцця насельніцтва.

Згодна са статыстыкай, колькасць зваротаў у органы кіравання з году ў год памяншаецца. Так, з пачатку года ў мясцовыя органы ўлады паступіла каля дзвюх тысяч зваротаў, што на 25 % менш, чым за такі ж перыяд мінулага года. Больш за 700 тэлефонных званкоў зарэгістравана падчас прамых тэлефонных ліній, а гэта на 200 званкоў менш, чым за леташні перыяд. Праведзена каля 670 прыёмаў грамадзян.

За работай са зваротамі грамадзян сочыць пастаянная абласная міжведамасная рабочая група, створаная ў 2015 годзе. Як паведаміла **начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Гродзенскага аблвыканкама Кацярына ФЕДАСЕНКА**, маніторынг раёнаў паказвае, што ў цэлым работа з насельніцтвам мясцовых выканаўчых органаў і іх структурных падраздзяленняў выконваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам. Разам з тым ёсць значныя недахопы, звязаныя з вядзеннем справаздачных дакументаў. Таксама ёсць выпадкі няўзгодненай работы структурных падраздзяленняў.

Каб павысіць дзейнасць органаў улады, у вобласці створана даволі шырокая сістэма работы з насельніцтвам, накіраваная на вывучэнне грамадскай думкі. Такі падыход дазваляе больш аператыўна вырашаць многія праблемы. Тут шмат руціннай работы, але неабходна разбірацца, каб задаволіць інтарэсы канкрэтных людзей, тлумачыць Кацярына Федасенка. У сваю чаргу, і вынікі тут часам больш відавочныя. У якасці прыкладаў вырашэння важных пытанняў спецыяліст называе атрыманне кватэры, месца ў дзіцячым садку, уладкаванне спартыўнай пляцоўкі, паркавай зоны і іншае. І ўсё гэта магчыма ажыццявіць праз намаганні дэпутатаў, якія рэгулярна праводзяць сустрэчы з выбаршчыкамі, вывучаюць грамадскую думку і патрэбы насельніцтва, садзейнічаюць у развіцці формаў мясцовага самакіравання.



Як адзначалася падчас пасяджэння, рабоце са зваротамі грамадзян аддаецца асаблівая ўвага, бо часам за зваротам канкрэтнага чалавека відаць праблему ў рэгіёне. Фактычна, звяртаючыся да дэпутата, чалавек уносіць прапанову па ўдасканаленні дзейнасці органаў кіравання. У сваю чаргу, улады прапануюць розныя формы ўзаемадзеяння. Гэта і прыёмы грамадзян у акругах, і прамыя лініі, і сустрэчы з выбаршчыкамі, і дні інфармавання, і дыялогавыя пляцоўкі. У Свіслацкім раёне ў дадатак да гэтага праводзіцца анкетаванне кожнага сельсавета адносна праблем, з якімі сутыкаюцца жыхары. Гэта дазваляе мець больш поўную карціну таго, чым жывуць людзі ў кожным населеным пункце, своечасова прыйсці на дапамогу тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Выкананне мерапрыемстваў бярэцца на кантроль райсаветам, паведаміў **старшыня Свіслацкага раённага Савета дэпутатаў Віктар СУБОТКА**. Напрыклад, за мінулы год і тры месяцы бягучага года атрымана больш за 60 прапаноў, якія прызнаны да выканання. Большая частка датычыцца добраўпарадкавання населеных пунктаў і рамонту дарог. Ёсць пытанні па забеспячэнні якаснай вадой, рамонце жыллёвага фонду, вулічным асвятленні.

— У апошнія гады ў выніку сістэмнай работы колькасць зваротаў змяншаецца, — расказаў Віктар Суботка. — Напрыклад, летась у раённы Савет дэпутатаў звярнулася дзевяць чалавек. Больш як у два разы зменшылася ў 2022 годзе колькасць зваротаў падчас прамых ліній.

Старшыня Свіслацкага райсавета лічыць, што гэта стала магчыма дзякуючы якаснаму вырашэнню пытанняў, якія ўваходзяць у кампетэнцыю ЖКГ.

Трэба сказаць, што падчас пасяджэння Прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў былі закрануты праблемныя пытанні ў рабоце жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Гэта той аспект, які традыцыйна акумулюе больш за ўсё скаргаў. **Старшыня Ваўкавыскага райсавета Віталь НАВІЦКІ** заўважае, што прадпрыемства ЖКГ не ў стане ахапіць усе патрабаванні насельніцтва. Напрыклад, за мінулы год паступіла 20 калектыўных зваротаў па лініі ЖКГ. А ўсяго ў 2022 годзе ва ўсе інстанцыі, на інтэрнэт-партале, па нумары 115 і ў іншыя органы Ваўкавыскага раёна зарэгістравана 40 тысяч зваротаў, з іх большая частка датычыцца менавіта жыллёва-камунальнай сферы.

— Многае зроблена, але шэраг пытанняў чакае вырашэння. Трэба завяршыць добраўпарадкаванне могілак, усталяваць ліхтары на некаторых вуліцах, адрамантаваць дарожныя ўчасткі і пешаходныя дарожкі, усталяваць дадатковыя аўтастаянкі. Разам з тым на мерапрыемствы, якія мы плануем ажыццявіць сёлета, бюджэтныя сродкі выдзелены, і ў рамках прадугледжанага фінансавання гэтыя работы будуць праведзены з належным кантролем якасці, — паведаміў Віталь Навіцкі.

Да ўсіх прысутных была даведзена інфармацыя аб выдзяленні Міністэрствам ЖКГ сродкаў на рамонт дарог і дахаў. Асабліва гэта датычыцца найбольш вострых пытанняў, якія цягнуцца даўно і патрабуюць неадкладнага вырашэння. Сродкі будуць размеркаваны ў раёны вобласці згодна з аб'ектыўнай патрэбай.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.**

# Раён наводзіць марафет

## Мясцовыя дэпутаты паказваюць у гэтым прыклад і каардынуюць работу

**Магілёўскі раён — напэўна, самы вялікі ў вобласці. У яго склад уваходзіць 15 сельскіх Саветаў, дзе пражывае 42 тысячы чалавек. Яшчэ амаль столькі ж прыбаўляецца ў летні перыяд. Гэта звычайныя дачнікі плюс жыхары 179 садовых таварыстваў. І трэба прыкласці шмат намаганняў, каб арганізаваць парадак на тэрыторыі. Сёння ў раёне поўным ходам ідзе месячнік навядзення парадку на зямлі — праводзяцца суботнікі, санітарныя дні, нават семінары.**

— Людзей на нашай тэрыторыі бывае шмат, і трэба выразна размеркаваць усе зоны адказнасці, — адзначае **старшыня Магілёўскага райсавета Сяргей ЯРОШЧАНКА.** — Праводзім сходы, дзе насельніцтва мае магчымасць сустрэцца з усімі зацікаўленымі службамі. Запрашаем камунальнікаў, каб загадзя скласці дагаворы на вываз смецця з тымі ж дачнікамі.

Суразмоўнік звяртае ўвагу на тое, што ў раёне распрацавана праграма навядзення парадку, дзе выразна прапісаны кожны населены пункт, кожная вуліца, хто за што адказвае, што павінна быць зроблена, з указаннем канкрэтных тэрмінаў. І кожны сельсавет зацвердзіў для сябе план дзеянняў. Паралельна ажыццяўляецца канцэпцыя па азеляненні раёна, дзе ўлічаны малыя архітэктурныя формы, клумбы, кветнікі.

— Вырашылі сёлета ў кожным аграгарадку ўздоўж пешаходных сцежак пасадзіць кветкі, — адзначае Сяргей Ярошчанка. — Будзе і прыгожа, і настрой узніме.

Хутка Радаўніца, і ў разгары навядзенне парадку на могілках — вывозіцца смецце, падвозіцца пясок, выразаюцца аварыйныя дрэвы.

— Найбольш складаная сітуацыя па могілках, якія каля горада, — дзеліцца набалелым старшыня райсавета. — Імі актыўна карыстаюцца гараджане, а гэта дадатковая нагрузка на раён. Напрыклад, на могілках у Бароўцы з больш як ста пахаваных за год людзей мясцовых — адзінкі. Улічваючы, што там тысячы пахаванняў, парадак навесці больш складана і стратна.

Налета Магілёўскаму раёну спаўняецца сто гадоў і шмат што трэба рэалізаваць, каб ён стаў яшчэ больш прыгожы і ўтульны. Напрыклад, дапамагчы насельніцтву памяняць агароджу там, дзе яна прыйшла ў непрыдатнасць. Зразумела, што задавальненне нятаннае, таму шукаліся найбольш прымальныя варыянты.

— Дамовіліся з дрэваапрацоўшчыкамі, што людзі змогуць набыць сабе плот па цане 24 рублі за дзесяць пагонных метраў, прычым у растэрміноўку, — удакладняе суразмоўнік. — Сельсаветы даюць агульную лічбу, пастаўшчыкі дастаўляюць груз оптам.



Па раёне плануецца ўстанавіць тры дзіцячыя пляцоўкі — у Палыкавічах, Мяжысетках, Буйнічах. Праекты ўжо праходзяць экспертызу, сельсаветы, дзе з'явіцца абсталяванне, вядуць перагаворы з насельніцтвам. Гульнявыя комплексы набываюцца за кошт бюджэтных сродкаў, астатняе — азеляненне, добраўпарадкаванне, пасадка дрэў — за жыхарамі. Яшчэ адна дзіцячая пляцоўка размесціцца ў Сумарокаве. Месцічы пагадзіліся ўзяць асабісты ўдзел у набыцці патрэбнага абсталявання і ўзяць частку выдаткаў на сябе. Астатнюю суму выдзяляе абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Нядаўна для старшынь сельсаветаў на базе аграгарадка Семукачы прайшло выязное навучанне па рабоце з Указам № 116. Вядома, што для эфектыўнай дзейнасці мала ведаць нарматыўныя дакументы, трэба ўмець будаваць дыялогі з мясцовымі жыхарамі.

**Старшыні Семукацкага сельсавета Тамары УКРУЖСКАЙ** было што расказаць з гэтай нагоды. Толькі за апошнія два гады на тэрыторыі сельсавета ўведзена ў севазварот 168 гектараў нявыкарыстаных зямель. На семінары разглядалі паслядоўнасць правядзення такой работы, канкрэтныя дзеянні па аптымізацыі зямельных участкаў.

У якасці прыкладаў разглядаліся пляцоўкі ў Вяліскіх Бялевічах і непасрэдна Семукачах. Выгляд Вяліскіх Бялевіч псавалі зарослыя ўчасткі. Летась яны былі цалкам ліквідаваны. Такім чынам было акультурана больш за 20 гектараў.

З пачатку года на тэрыторыі сельсавета ў рамках 116-га Указа прададзена 12 пустых дамоў. Гэта значыць і яны, і зямля вакол іх (а менш як 25 «сотак» ніхто не афармляў) набудуць прыстойны выгляд. У хуткім часе на продаж пойдзе яшчэ 21 дом.

— Попыт на іх вялікі, — сцвярджае суразмоўніца. — Калі мы 12 дамоў выставілі на продаж, пакупнікі адразу ж знайшліся. Яшчэ і жадаючыя засталіся. Вельмі шмат ахвотных купіць дамок.

Тамара Укружская ўся ў рабоце, разам з камандай аднадумцаў грабе лісце, пілуе дрэвы, фарбуе помнікі.

— Усе мы зацікаўленыя, каб на зямлі быў парадак, — кажа яна. — У нас у рабоце задзейнічаны і прадпрыемствы, і арганізацыі, і сельвыканкам, і насельніцтва. У адносінах да нядбайных жыхароў выпісваем прадпісанні, складаем пратаколы. Людзі ведаюць, што дровы, пясок, будматэрыялы і гэтак далей з зямель агульнага карыстання вясной трэба прыбіраць. І пытанні не ўзнікаюць. Акрамя таго, жыхары актыўна задзейнічаны ў суботніках — прыбіраюць паркі, фарбуюць абсталяванне на дзіцячых пляцоўках. І, як правіла, грошы на фарбу збірае менавіта насельніцтва.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота Семукацкага сельсавета.**

# «Соткі» — трактарам, агарод — мотаблокам

## Хто дапамагае ў сяўбе вясковаму гаспадару

**На Брэстчыне поўным ходам ідзе сяўба не толькі ў сельгасарганізацыях, але і ў прыватных гаспадарках. Карэспандэнт пацікавілася ў кіраўнікоў мясцовай улады, як вяскоўцу гэтай вясной пасадзіць бульбу, узараць агарод, хто яму ў тым дапаможа.**

**Вольга АЎДЗЕЙЧЫК, старшыня Зеляневіцкага сельскага Савета Пружанскага раёна:**

— Наш сельсавет — самы аддалены ад райцэнтра: ад Пружан да Зеляневіч крыху больш за 60 кіламетраў. У склад адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ўваходзяць 24 населеныя пункты. Праўда, у асобных вёсках засталося літаральна па некалькі жыхароў.

Што датычыцца пасадкі «сотак», апрацоўкі агародаў, то сістэма тут даўно наладжана. Гаспадаркі, якіх на тэрыторыі сельсавета дзве — філіял «Аграэнерга Зеляневічы» РУП «Брэстэнерга» і ААТ «Радзіма», — бульбу як супрацоўнікам, так і пенсіянерам садзяць сваёй тэхнікай, дапамагаюць у апрацоўцы, затым выкопваюць. Нашы старасты толькі рыхтуюць спісы ахвотных. Для гэтага яны абыходзяць усіх жыхароў і запісваюць, хто колькі «сотак» хоча пасадзіць у полі. Бяруць «соткі» цяпер далёка не ўсе, многія ў вёсках не трымаюць жыўнасці, а для сябе хопіць, калі пасадзіць мех-другі на агародзе. Дык вось, з ахвотных пасадзіць у полі заказваюць па 5 альбо 10 «сотак», зусім рэдка бяруць 20. Мы падлічваем агульную плошчу паводле спісаў. Напрыклад, у суме атрымліваецца два гектары з вёсак адной гаспадаркі, гэтыя звесткі падаём у кантору сельгаспрадпрыемства. Там вызначаюць дзень, апавяшчаюць насельніцтва. Людзі рыхтуюць насенне, зранку машына праходзіць па вёсках, насенне забіраюць, потым высаджваюць на «сотках». Расцэнкі на паслугі, іншыя нюансы пасадкі вяскоўцы ведаюць загадзя, таму пытанняў не ўзнікае. Як пасадка, так і іншыя работы па вырошчванні бульбы праходзяць арганізавана і дакладна.

— Апрацоўка агародаў на прысядзібных участках становіцца клопатам саміх вяскоўцаў і іх дарослых дзяцей, — працягвае Вольга Віктараўна. — Скажам, ёсць у нас вёска Брантоўцы, у якой засталіся тры сталыя жыхары. У аднаго з іх ёсць уласны матаблок. Дык вось, яго сын, калі прыязджае, акрамя таго што заарэ бацькаўскі агарод, дапаможа і дваім суседзям.

На тэрыторыі недзе з паўдзясятка вяскоўцаў мае ўласныя трактары. Людзі яны станоўчыя, своечасова праходзяць тэхагляды, маюць патрэбныя дакументы на аказанне паслуг. Напрыклад, Уладзімір Мацвейчык з Галоўчыц дапамагае гаспадарам не толькі са сваёй вёскі, але і жыхарам Зіновіч, Зеляневіч, Рачкоў. Уладзіміра Яўгенавіча добра ведаюць у акрузе і кожны сезон заказваюць яго паслугі па апрацоўцы прысядзібных участкаў. Пра гэтага чалавека чую толькі добрыя водгукі. Ён і работу зробіць якасна, і ўважліва паставіцца да сталых, адзінокіх пенсіянераў.



**Наталля ХОМІЧ, старшыня Мілейкаўскага сельскага Савета Івацэвіцкага раёна:**

— З нашых 15 населеных пунктаў бульбу садзяць на «сотках» жыхары ўсяго шасці вёсак. На тэрыторыі працуюць два сельгаспрадпрыемствы — ААТ «Мілейкі» і ААТ «Агратэхсэрвіс». Апошняе не толькі выдзяляе зямлю пад «соткі», але і аказвае поўны пакет паслуг. Сельгаспрадпрыемства «Мілейкі» бульбай не займаецца, таму толькі выдзяляе поле пад «соткі», папярэдне апрацоўваючы яго належным чынам. Але гэта не праблема для нашых гаспадароў. У адных толькі Мілейках у прыватным карыстанні восем трактароў. І кожны чалавек аднаму з трактарыстаў, як той казаў, кум, сват ці брат. Таму людзі загадзя дамаўляюцца, па чарзе садзяць бульбу, апрацоўваюць агароды. Трактары ёсць і ў Бусяжы, і ў Грыўдзе, у іншых вёсках. Паколькі прапаноў многа, пэўная канкурэнцыя на гэтым рынку спрыяе разумнаму цэнаўтварэнню. Бывае, цікаўлюся і прыходжу да высновы, што ў нас цэны ніжэйшыя, чым у іншых сельсаветах, суседніх раёнах.

**Сяргей ЛЕШЫК, старшыня Ляснянскага сельскага Савета Баранавіцкага раёна:**

— Наш сельсавет, відаць, адзіны ў вобласці, на тэрыторыі якога няма сельгаспрадпрыемства. Недзе ў сярэдзіне 1990-х, калі ранейшая гаспадарка, якая спецыялізавалася на авечкагадоўлі, стала нерэнтабельнай, яе скасавалі, а землі перадалі фермерскім гаспадаркам. Такім чынам, у пытаннях пасадкі бульбы, апрацоўкі прысядзібных участкаў стаўка робіцца ў асноўным на прыватніка. У дзевяці населеных пунктах сельсавета ў прыватнай уласнасці знаходзіцца 16 трактароў. Чым не мехдвор сярэдняга калгаса?

Іх гаспадары рэгіструюцца ў падатковай інспекцыі, плацяць невялікі, амаль сімвалічны, падатак, каб працаваць на легальнай аснове, з гэтым усё ў парадку. А з прыходам вясны выходзяць на палеткі аднавяскоўцаў, каб правесці пасяўную кампанію. Цэны на паслугі ўстанаўліваюць у межах разумнага з разлікам, каб паклікалі і ў наступны раз. Трактарысты-прыватнікі праводзяць любую работу: падрыхтоўку глебы, вываз і раскідванне арганікі, пасадку і апрацоўку бульбы, сяўбу збожжавых, у сезон — уборку ўраджаю.

Аказваюць падобныя паслугі таксама невялікія прадпрыемствы і арганізацыі, што ёсць на тэрыторыі. Напрыклад, участак чыгункі станцыі "Лясная" мае трактар, ёсць трактар і ў Ляснянскага дома-інтэрната. Пры наяўнасці вольнага часу ў трактарыстаў яны таксама аказваюць паслугі насельніцтву. Для гэтага грамадзяніну трэба наведаць названую арганізацыю і аформіць належным чынам заяўку. Усе стараюцца дамаўляцца загадзя, таму ніхто без патрэбных вясной паслуг не застаецца.

**Сяргей БАРГАМОН, старшыня Крывошынскага сельскага Савета Ляхавіцкага раёна:**

— У нас, як і ў іншых сельсаветах, сістэма аказання паслуг даўно наладжана. На тэрыторыі функцыянуюць дзве гаспадаркі. Закрытае акцыянернае таварыства «Белпрампрыбор» аказвае поўны пакет паслуг: і пасадзяць бульбу, і апрацуюць, і выкапаюць увосень. Унітарнае прадпрыемства «Ліпнянка» бульбай не займаецца, таму для насельніцтва яны толькі рыхтуюць глебу. Але праблемы ў дадзеным плане ў жыхароў вёсак няма, на дапамогу заўсёды прыйдзе прыватнік.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

# ДАДОМУ ПА ВАДЗЕ

## Як забяспечваюць нармальнае жыццё людзям, адрэзаным паводкай ад «вялікай зямлі»

**«Звязда» яшчэ ў канцы студзеня наведвала пасёлак Палянаўка, што ў Веткаўскім раёне Гомельшчыны. Тады талымі водамі аказалася затопленая дарога да населенага пункта і найбліжэйшага садовага таварыства. Заложнікамі вялікай вады стала больш за два дзясятка вяскоўцаў. Для людзей, якія мусілі выязджаць з дому па сваіх справах, была арганізавана лодачная пераправа, а калі адталую не ў пару пойму скаваў лютаўскі мароз — пешы маршрут па лёдзе. Цяпер вясновая паводка — Сож сёлета асабліва шчодры на ваду, а побач яшчэ і возера — зноў адрэзала Палянаўку ад астатніх населеных пунктаў сельсавета. Але мясцовыя жыхары перасяляцца на «вялікую зямлю» не збіраюцца. Як у воднай ізаляцыі арганізавана ўсё неабходнае для жыцця людзей, зноў на свае вочы пабачыла карэспандэнт «Звязды».**



Прадаўцу Гомельскага цэнтральнага рынка Сняжане ПАЛЯКОВАЙ дапамагае «адкрываць вітрыну» на лодцы жыхарка Палянаўкі Марыя ЛУК'ЯНЕНКА.

### Лодка-крама

— Традыцыйна вязу шмат розных «малочкі», хлеба, белай выпечкі, — рыхтуецца «адкрываць» імправізаваную вітрыну прама на носе выратавальнай лодкі **прадавец Гомельскага цэнтральнага рынка Сняжана ПАЛЯКОВА.**

На рэйсах аўтакрамы на гэтым кірунку Веткаўскага раёна спецыяліст працуе восьмы год. Жыхароў Палянаўкі ведае паіменна. Пакуль дабіраемся да пасёлка, проста з ракі прадавец па тэлефоне дае сігнал сваім пакупнікам: «Збірайцеся! Едзем!»

Вялікая вада пасёлак абступіла з усіх бакоў. Для работы лодкі-крамы спецыялісты Веткаўскай выратавальнай станцыі Таварыства выратавання на водах сумесна з мясцовымі жыхарамі абралі месца ў пачатку старадаўняй алеі. Пакуль «швартуемся», першыя пакупнікі ўжо чакаюць на беразе.

— Хтосьці бярэ для сябе, хтосьці і для суседзяў, калі хто з іх не змог прыйсці, — тлумачаць палянаўцы і зачытваюць прадаўцу свае шопінг-шпаргалкі.

— Я вось сама не езджу ў горад. Тут з лодкі ўсё купляю ці муж ідзе раз у трое сутак на змену на работу ў горад і прывозіць прадукты. Ён таксама на лодцы з хлопцамі-ратавальнікамі вяртаецца дадому, — тлумачыць жыхарка Палянаўкі Ала Антоненка.

Па малако, кефір, смятану, хлеб, сасіскі прыйшла да лодкі-крамы і Любоў Малюшына:

— Заказваем у нашай Сняжаны пакуль толькі самае неабходнае, а калі захочацца нечага вельмі смачнага, то нас дастаўляюць на лодцы ў найбліжэйшы аграгарадок, Старое Сяло. Адтуль ужо можна і да Гомеля дабрацца: там закупіцца, а потым на лодцы вярнуцца дамоў.

Даводзіцца перапраўляцца па рацэ і тым з палянаўцаў, каму неабходна зняць грошы з банкаўскай карткі ў горадзе або аплаціць «камуналку», — тлумачыць мясцовы жыхар Уладзімір Мельнікаў:

— Да тых жа, хто атрымлівае пенсію праз пошту, на лодцы паштальён прыплывае, — кажа мужчына. Нягледзячы на тое, што ён выбіраецца ў горад, па прадукты, купляе і тавары з лодкі.

Увогуле вясковая аўтакрама, якую на час паводкі давялося перавесці ў плыўфармат, па-ранейшаму сярод жыхароў Палянаўкі карыстаецца вялікім попытам. У пасёлку жыве крыху больш за 20 чалавек, шмат пенсіянераў, некалькі — ужо вельмі сталага ўзросту, і яны ніяк не змогуць паехаць па пакупкі ў горад ці нават у найбліжэйшы аграгарадок. Таму прадавец аўтакрамы для палянаўцаў шмат што прывозіць пад заказ.



На кантролі выконваючага абавязкі начальніка Веткаўскай выратавальнай станцыі таварыства выратавання на водах Сяргея СІЛКІНА — прафілактыка бяспекі жыхароў пасёлка падчас паводкі.

— Звычайна пры дастаўцы на машыне абарот большы, бо лодка змяшчае меншы аб'ём прадукцыі, але выходзіць па-рознаму. Перад святамі людзі заказалі шмат. Вязу абавязкова стандартны прадуктовы набор: малако, кефір, смятана, каўбаса, хлеб, батон. Пад заказ — і гародніну, і садавіну. Калі камусьці патрэбныя прамысловыя тавары, таксама — калі ласка. Вязу і мыйныя сродкі, пральныя парашкі, зубныя пасты, шчоткі, — тлумачыць прадавец. Як і з аўтакрамай, у рэйсы на лодцы супрацоўнік выязджае ў Палянаўку два разы на тыдзень.

### Старэйшына-сувязны

Усе пажаданні адносна прадуктаў ці прамысловых тавараў мясцовыя жыхары перадаюць праз памочніка старшыні Хальчанскага сельвыканкама па пасёлку Палянаўка Аляксандра Францішова. Аляксандр Аляксандравіч, у сваю чаргу, перадае заяўкі прадаўцу аўтакрамы.

— З вечара, напярэдадні рэйса, звязваюся з нашымі жыхарамі або яны са мной, складаю спіс, хто што хоча, і перадаю нашай Сняжане. Увогуле людзі ўсім задаволены, — перадае памочнік старшыні.

Аляксандр Францішоў на такой грамадскай рабоце ў пасёлку — звыш дзесяці гадоў. Аб любой сітуацыі, якая хвалюе палянаўцаў, ён аператыўна інфармуе старшыню сельвыканкама ці адказныя службы ў раёне. Кажа, жыхары пасёлка, адрэзанага ад іншых населеных пунктаў сельсавета паводкай, шчыра ўдзячныя за штодзённую дапамогу спецыялістам Веткаўскай выратавальнай станцыі Таварыства выратавання на водах.

